ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЇН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICHKRAJOW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
Менск, Пляц Волі № 17.
1-шы паверх
тэл.: Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ
МІТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

Белорусская Беларусь
Библиотека 3 Публичная
г. Москва, УССР им. Ленина
Инв. № адзін экз.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 6 (3095)
ЧАЦЬВЕР
8
СТУДЗЕНЯ
1931 ГОДУ

КОШТ НУМАР У КАП.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Трэцяя Сэсія ЦВК Саюзу ССР

Выкананьнем праграмы 3 рашаючага году пяцігодкі

завяршым пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР

Няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, разьбіваючы ўшчэнт клясавых ворагаў і іх агентуру—правых і „левых“ апартуністаў, ачышчаючы і ўмацоўваючы савецкі апарат--забясьпечым выкананьне народна-гаспадарчага пляну СССР

Даклад Старшыні СНК СССР тав. В. М. МОЛАТАВА (Скрабіна)

АБ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫМ ПЛЯНЕ НА 1931 Г.

ПЫТАНЬНІ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА

Таварышы! Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі Саюзнаму ЦВК і СНК прыходзіцца разглядаць ужо шосты раз. Першыя кантрольныя лічбы, як вядома, былі выпрацаваны яшчэ для 1925-26 году. У далейшым ад кантрольных лічбаў на адзін год мы перайшлі ня толькі да выпрацоўкі, але і да ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі. Цяпер, на парозе трэцяга году пяцігодкі, мы падагульваем вынікі першых двух год і прымаем заданьні на 1931 год. Мне прыдзецца спыніцца толькі на самых асноўных пытаньнях народна-гаспадарчага пляну на 1931 год, толькі на пытаньнях, вызначаючых палітычную лінію, бо апроч майго дакладу, будзе яшчэ даклад старшыні Дзяржпляну Саюзу т. Куйбышава, які дэталізуе гаспадарчыя заданьні і задачы на бягучы год.

Да вынікаў першых двух год пяцігодкі

Пачну з вынікаў першых двух год пяцігодкі. Гэтыя вынікі зьяўляюцца, з аднаго боку, праверкай нашага лавіраваньня і, з другога,—праверкай наяўных у рабочай клясы сіл і магчымасьцяй у ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва. Аб выніках першых двух год выкананьня пяцігодкі лепш за ўсё меркаваць, параўнаючы гаспадарчыя заданьні на гэты пэрыяд і фактычнае іх выкананьне. У сувязі з гэтым я спынюся толькі на 4-х момантах.

Папершае, пытаньне аб народным прыбытку. Па пяцігадоваму пляну народны прыбытак за мінулы час павінен быў узрасьці да 58,3 мільярдаў р. А што мы маем у сапраўднасьці? У сапраўднасьці-ж за гэты пэрыяд народны прыбытак у параўнаўчым відзе павялічыўся да 59,5 мільярдаў рублёў. Такім чынам, на справе мы маем перавышэньне пастаўленых у пяцігадовым пляне заданьняў па прыросту народнага прыбытку, дасягаючым 106 проц. пяцігадовага пляну.

Падругое, валавая прадукцыя прамысловасьці. Па пяцігадоваму пляну прамысловасьць СНГ за першыя два гады пяцігодкі павінна была даць валавой прадукцыі на 29,3 мільярды руб. А што мы маем на справе? На справе валавая прадукцыя прамысловасьці СНГ за двухгадовы пэрыяд склала 30,5 мільярдаў руб. Плян выкананы ў разьмеры 104 проц.

Патрэцяе, капітальныя ўкладаньні ў гадовыя фонды аграмаджанага сэктару (прамысловасьць, транспарт, саўгасы, калгасы і г. д.). Пытаньне аб капітальных укладаньнях мае асаблівае значэньне, бо капітальныя ўкладаньнямі вызначаецца далейшы рост народнай гаспадаркі, г. зн. далейшы рост валавой прадукцыі прамысловасьці, і пры тым ня толькі прамысловасьці. Як-жа выконваліся заданьні пяцігодкі па капітальных укладаньнях? Лічбы паказваюць, што замест 12,7 мільярдаў руб., запраектаваных плянам, фактычна капітальныя ўкладаньні за двухгадовы пэрыяд дасягнулі 13,8 мільярдаў руб. І тут мы маем перавыкананьне пяцігадовага пляну, дасягнуўшага 109 проц. у пяцігодцы.

Нарэшце, чацьвёртае, дзяржаўны бюджэт. Пяцігодкай за першыя два гады дзяржаўны бюджэт прадугледжваўся ў суме 17 мільярдаў руб. А ці выкананa гэта заданьне. Ня толькі выкананa, але і значна перавыкананa. Бюджэт за мінулае двухгодзьдзе склаў 21 мільярд руб., дасягнуўшы 124 проц. да заданьняў пяцігодкі.

Вось важнейшыя вынікі выкананьня пяцігодкі за першыя два гады. Яны дэталёва паказальны для характарыстыкі посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. На падставе гэтых посьпехаў, на падставе барацьбы рабочай клясы за ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну, мы атрымалі вялізарнейшыя эрухі ня толькі непасрэдна ў эканамічным, але і ў сацыяльным разьвіцьці нашай краіны.

Асабліва вялікае значэньне мае тое, што адбылося за мінулы пэрыяд на вёсцы, у найбольш адсталай галіне гаспадаркі. Паварот сялянскіх мас да сацыялізму, паварот серадняка на шлях калектывізацыі зьяўляецца фактам вялізарнага гістарычнага значэньня. Гэты рашаючы для апошняга пэрыяду факт у разьвіцьці нашай краіны стварыў прадпасылкі для пэўнага павароту ў палітыцы савецкай улады. Гэты паварот заключаўся ў тым, што ад палітыкі абмежаваньня «кулацкіх» элемэнтаў вёскі мы перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы. Зроблены Кастрычнікавай рэвалюцыяй разром капіталістаў і абшарнікаў заваяваецца зараз ліквідацыяй кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі. Пасьля Кастрычнікавага перавароту—гэта важнейшы крок савецкай улады наперад. Будаўніцтва сацыялізму на падставе індустрыялізацыі краіны і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі—вось тое, што вызначае палітыку савецкай улады ў сучасны пэрыяд. Самы факт, што рабочая кляса пасьпяхова ажыцьцяўляе гэту палітыку, гаворыць аб пераможным руху наперад справы сацыялізму, але калі за першыя два гады пяцігодкі мы дамагліся вялікіх посьпехаў, дык поруч з гэтым мы не павінны забываць і аб наяўнасьці буйных недахопаў у нашай рабоце.

Мінулы гаспадарчы год, а таксама толькі-што закончаны так званы «асобны квартал», г. зн. 3 апошнія месяцы 1930 году, падкрэсьліваюць гэтыя асноўныя недахопы нашай гаспадарчай работы. Дастаткова зазначыць на тое, што кантрольныя лічбы на 1929-30 год і на асобны квартал па прыросту прамысловай прадукцыі далёка ня цалкам выкананы, і што ня поўнасьцю выкананым аказалася таксама заданьне па зьніжэньні сабекошту. Недавыкананьне вытворчай праграмы прамысловасьці і заданьня па зьніжэньні сабекошту ў другім годзе пяцігодкі і ў асобным квартале 1930 году адбылося ня гледзячы на вялічэзны рост творчай актыўнасьці рабочых мас, ня гледзячы на ўсё ўзрастаючую арганізаванасьць удзелу рабочых у гаспадарчым будаўніцтве. Прычынай гэтага належыць прызнаць недахопы гаспадарчага кіраўніцтва, а менавіта—недастатковае ўменьне сапраўды заўсёды быць на чале рабочых мас, абапірацца ў справе будаўніцтва сацыялізму на бязупынна ўзрастаючую актыўнасьць пралетарыяту і ўсіх працоўных. Праўда, заданьне пяцігодкі аб прыросьце прамысловай прадукцыі для 1929-30 году на 21 проц. мы ня толькі выканалі, але і перавыканалі, дабіўшыся прыросту прамысловай прадукцыі за гэты год на 25 проц., але заданьні па пляну кантрольных лічбаў як у гэтай галіне, так і па раду іншых паказальнікаў аказаліся ўсё-ж ня выкананымі. Не дапусьціць гэтага ў гэтым годзе—наш найпершы абавязак. Перайду да задач трэцяга году пяцігодкі — да кантрольных лічбаў на 1931 год.

1931 год—рашаючы год у справе ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў чатыры гады

Каб выразьней паказаць гаспадарчы малюнак 1931 г., мне прыдзецца па раду асноўных элемэнтаў правесьці параўнаньне народна-гаспадарчага пляну на бягучы год з вынікамі папярэдняга году. Для характарыстыкі-ж росту народнай гаспадаркі ў цэлым я спынюся толькі на двух пытаньнях: на народным прыбытку і на дзяржаўным бюджэце.

Аб народным прыбытку.

Якая-ж сума прыросту народнага прыбытку прадугледжваецца намі ў 1931 годзе і які прырост праектуецца плянам па адпаведных дэкых за мінулы год? Адпаведныя даныя паказваюць, што за 1930 г. народны прыбытак дасягнуў сумы 35 мільярдаў р. Лічба дастаткова вялікая. Аднак, у 1931 годзе народны прыбытак, па пляну, павінен будзе скласьці 49 мільярдаў руб., г. зн. прыблізна тую-ж лічбу, якая меркавалася для апошняга году пяцігодкі. У параўнаньні з папярэднім годам прырост народнага прыбытку дае павялічэньне на 39 проц., (да гэтага часу ў нашых афіцыйных разьлічэньнях мы з асьцярожнасьці ўжывалі фармулу «ня менш 35 проц.»).

Цікава параўнаць гэтыя лічбы з данымі прыросту народнага прыбытку ў дарэвалюцыйны час. Аказваецца, за пэрыяд з 1900 году да 1913 г., г. зн. за поўныя 13 год, прырост народнага прыбытку ў царскай Расіі дасягнуў 39 пр., ці ў сярэднім 2,6 проц. за год. Такім чынам, той процант прыросту народнага прыбытку, які ў царскай Расіі зьявіўся вынікам разьвіцьця народнай гаспадаркі за 13 год, у наш час павінен адбыцца ў працягу аднаго году. Адно тое гэта параўнаньне паказвае на якую вялікую дарогу вышла наша краіна.

Але гэты малюнак варта папоўніць яшчэ адным штрыхам. Параўнаем прырост народнага прыбытку ў СССР з прыростам народнага прыбытку ў капіталістычных краінах. Адпаведныя даныя адносна Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Англіі і Нямеччыны за апошнія пяць год (1925-29 г. г.) паказваюць, што ў гэтых краінах у сярэднім штогодны прырост народнага прыбытку складае ад 3 да 6 проц. І гэта параўнаньне гаворыць яўна не ў карысьць капіталізму, а ў карысьць СССР.

Перайду да довадаў росту нашага дзяржаўнага бюджэту. З году ў год дзяржаўны бюджэт Савецкага Саюзу значна ўзрастае. У гэтым годзе ўзрастаньне павінна быць асабліва вялікім. Сьнежаньская (1929 г.) сэсія ЦВК дзяржаўны бюджэт на 1929-30 год вызначыла ў 11,6 мільярдаў руб. Зараз Савет Народных Камісараў прадстаўляе на вашае зацьверджаньне дзяржаўны бюджэт у разьмеры 21,7 мільярдаў руб., г. зн. амаль у два разы вышэй за мінулагодні. Праўда, з часу апошняй сэсіі ЦВК дзякуючы рабоце разгорнутай партыяй і савецкай уладай у галіне гаспадарчага будаўніцтва, першапачаткова запраектаваны дзяржаўны бюджэт у працягу года значна ўзрос і склаў фактычна 12,6 мільярдаў руб. Аднак і для 1931 году мы можам таксама з поўнай упэўненасьцю разьлічваць ня толькі на поўнае выкананьне заданьняў па дзяржаўным бюджэце, але і на перавыкананьне гэтых заданьняў. Параўнаньне росту дзяржаўнага бюджэту з ростам народнай гаспадаркі паказвае таксама на тое, што значная частка прыросту прыходзіць непасрэдна праз дзяржаўны бюджэт і тым самым забясьпечваецца накіраваньне яе па асноўных лініях сацыялістычнага будаўніцтва.

З паданых асноўных даных народнагаспадарчага пляну на 1931 год можна з поўнай падставай зрабіць наступны агульны вывад: матар'яльная база краіны саветаў шпарка і бязупынна расьце, савецкая ўлада няўхільна мацнее. Значэньне гэтых даных будзе асабліва ясным, калі прааналізаваць накіраваньне разьвіцьця народнай гаспадаркі СССР і выявіць, у якой меры рост народнага прыбытку забясьпечвае ажыцьцяўленьне асноўнай задачы—задачы індустрыялізацыі краіны. Адказам на такое запытаньне служаць, перш усяго, даныя аб капітальных укладаньнях. У 1931 годзе мы будзем мець тут новы гіганцкі крок наперад. У параўнаньні з мінулым годам, калі капітальныя ўкладаньні ў аграмаджаны сэктар (прамысловасьць, транспарт, сельскую гаспадарку) складалі 9.771 мільёнаў руб., капітальныя ўкладаньні гэтага году, складаючыя суму ў 17 тысяч мільёнаў руб., даюць прырост на 74 проц. Гэты процант прыросту вышэйшы за мінулыя гады. Большая частка капітальных укладаньняў і зараз ідзе па лініі прамысловасьці. Усяго ў прамысловасьць, разам з электрастанцыямі, у трэцім годзе пяцігодкі ўкладаецца 7.465 мільёнаў рублёў. Калі-ж узяць толькі ўкладаньні ў капітальнае будаўніцтва па прамысловасьці, плянуемай ВСНГ, дык акажацца, што з агульнай сумы гэтых укладаньняў (5,5 мільярдаў руб.) больш, чымся 5 мільярдаў ідзе на капітальнае будаўніцтва па групе цяжкай прамысловасьці (група «А»).

Заўвага: у лёгкую індустрыю, апроч укладаньняў па лініі ВСНГ ідуць укладаньні і па лініі Наркамснабу.

Асноўныя ўкладаньні па групе «А» ідуць на капітальнае будаўніцтва па чорнай мэталюргіі, мэталапрацоўцы, апалу, хэміі, прамматар'ялах і г. д. Капітальныя-ж укладаньні на электрабудаўніцтва павялічваюцца з 450 мільёнаў да 900 мільёнаў руб., г. зн. узрастаюць у два разы. Гэтыя лічбы яскрава характарызуюць асноўнае накіраваньне матар'яльных рэсурсаў, якое праводзіцца нашай дзяржавай. Народна-гаспадарчы плян на 1931 год прадугледжвае згрупаваньне ўкладаемых сродкаў на хутчэйшым пуску ў ход пачатага раней будаўніцтва. Гэта павінна забясьпечыць пуск новых прадпрыемстваў, майстэрняў і ўстановак на важнейшых участках прамысловага будаўніцтва і ў першую чаргу па лініі закладзеных раней заводаў і цэхаў цяжкай індустрыі. Не распыляючы сродкаў на закладаньне вялікай колькасьці новых прадпрыемстваў, мы ставім сваёй задачай, шляхам такога паскораньня работ, пусьціць у ход закончаныя ў гэтым годзе новыя будаўніцтвы коштам ня менш, чымся 4 мільярды руб. Каб убачыць, наколькі значная гэта лічба, дастаткова сказаць, што яна амаль роўна асноўнаму капіталу ўсёй цэнзавай прамысловасьці царскай Расіі ў 1913 годзе. Магчымасьць паскораньня пуску новага будаўніцтва ў нас маецца дзякуючы тым капітальным укладаньням, якія мы зрабілі ў мінулыя гады. Гэта адначасова зьяўляецца адным з паказьнікаў вялікіх унутраных рэсурсаў, якія мы маем і якія мы павінны навучыцца значна лепш выкарыстоўваць.

Паглядзім зараз, як зьмяняюцца адносіны паміж прамысловым і непрамысловым сэктарам па выніках вытворчасьці, па прадукцыі. Як вядома, у нас ня толькі прамысловасьць, але і сельская гаспадарка сталі на шлях хуткага ўздыму. Аднак, і тут цалкам адбіваецца гегемонія прамысловасьці. Калі ў 1931 годзе мы павінны атрымаць значны прырост сельска-гаспадарчай прадукцыі, дык усё-ж намечаны кантрольнымі лічбамі прырост гадовай прамысловай прадукцыі на 45 проц. пераконваюча гаворыць аб посьпехах індустрыялізацыі ў нашай краіне. 45-процантны прырост прамысловай прадукцыі азначае, што калі ў 1930 годзе мы мелі падвойную даваенную прадукцыю буйнай прамысловасьці, дык у 1931 годзе мы будзем мець патройную даваенную прадукцыю. З усімі магутнымі тэмпамі расьце зараз наша індустрыя.

Калі ўлічыць, што 45 проц. гадовага прыросту прампрадукцыі ў два разы перавышаюць процант прыросту прампрадукцыі для трэцяга году пяцігодкі (дзе прадугледжан прырост толькі на 22 проц.), дык гэта азначае, што выкананьне прапануемай на ваша зацьверджаньне вытворчай праграмы будзе азначаць, што мы на справе пяцігодку выконваем у чатыры гады.

Доля індустрыі ў агульнай гадовай прадукцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі за 1931 год у параўнаньні з мінулым годам, таксама ўзрастае. Калі ў другім годзе пяцігодкі аднесная вага індустрыі ў валавой прадукцыі ўсёй прамысловасьці і сельскай гаспадаркі складала 67 проц., дык у гэтым годзе яна павялічваецца да 69 проц. і гэты прыклад, ілюструючы хуткасьць росту савецкай індустрыі, паказвае, што бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі ў нашай краіне ажыцьцяўляюцца ўжо на справе. Урэшце менавіта гэты факт, факт хуткай індустрыялізацыі краіны—і вызначае ў асноўным усе ланцугі сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. З гэтых фактаў мы павінны зрабіць вывад: трэба ў далейшым моцна трымаць бальшавіцкія тэмпы разгортваньня індустрыі, трэба цьвёрда ісьці наперад па гэтым шляху, усямерна замацоўваючы ўсе ланцугі індустрыялізацыі.

Наш курс на індустрыялізацыю зьяўляецца курсам на сацыялістычную індустрыялізацыю. Рост буйнай індустрыі пры савецкім ладзе зьяўляецца асноўным элемэнтам росту сацыялізму. У будаўніцтве сацыялізму рашаючую ролю адыгрывае індустрыя, бо яна прадстаўляе сабой тую галіну гаспадаркі, якая цалкам падпарадкавана плянаваму кіраўніцтву дзяржавы і пабудавана на вышэйшай тэхнічнай аснове. З другога боку ідзе асабліва шпаркім тэмпам рост сацыялістычных элемэнтаў ва ўсёй народнай гаспадарцы, паколькі за апошнія два гады і сельская гаспадарка пачала хутка і беззваротна пераходзіць на рэйкі буйнай гаспадаркі, дзяржаўнай і калектыўнай, базаю якой усё больш становіцца высокая мэханічная тэхніка (трактары, камбайны і інш.). У выніку адносная вага сацыялістычнага сэктару, усё ўзрастаючая ў народным прыбытку ў гэтым годзе, узьнімаецца значна на вышэй за мінулагоднюю, а менавіта з 75 проц. у 1930 годзе яна павялічваецца да 82 проц. У асноўных фондах доля сацыялістычнага сэктару ўзрастае з 61 проц. да 69 проц.

Вялізарнае значэньне, нарэшце, мае тое, што ў 1931 годзе сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі дасягне абсалютнай перавагі. На росьце сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы неабходна спыніцца асобна. Калі ўся пасеўная плошча 129 мільёнаў га павінна павялічыцца ў 1931 годзе да 143 мільёнаў га (тут, як і ў радзе іншых выпадкаў, лічбы бяруцца са звычайным акругленьнем), дык большая частка гэтага прыросту прыпадае на аграмаджаны сэктар. Працягваючы разгортваць работу па арганізацыі беднаты і па падтрыманьні аднаасобнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі, савецкая ўлада прымаючы пад увагу паварот асноўных сялянскіх мас на шлях калектывізацыі, перанесла цэнтр вагі сваёй работы на вёсцы на падтрыманьне калгаснага руху. Тут, у калгасным руху ў будаўніцтве саўгасаў, ляжыць самы глыбокі корань савецкай улады на вёсцы. Калгасьнікі сапраўды моцныя і ўсё ўзрастаючая апора савецкай улады на вёсцы. У канцы 1930 г. у калгасы ўжо ўвайшло 26 проц. усёй масы сялянскіх гаспадарак. Калгасы здолелі ўжо паказаць вялізарныя перавагі перад аднаасобнай сялянскай гаспадаркай. І па хуткасьці пашырэньня пасеўнай плошчы, і па росту ўраджайнасьці на баку калгасаў ужо маецца яўная і бясспрэчная перавага. Ды інакш і не магло быць, асабліва ва прымаючы пад увагу ўзрастаючае ўжываньне машын у калгаснай вытворчасьці. Наступныя лічбы навочна паказваюць значэньне ўжо дасягнутых посьпехаў у калектывізацыі. Да пачатку 1931 году ў калгасы ўвайшло звыш 6 мільёнаў сялянскіх гаспадарак, такі дасягнуты ўжо вынік калгаснага будаўніцтва, ня гледзячы на вясеньнія адлівы, якія меліся тады ў радзе раёнаў. Цікава гэтую лічбу 6 мільёнаў калектывізаваных сялянскіх гаспадарак параўнаць з агульнай колькасьцю сельскіх гаспадарак у такіх краінах, як Нямеччына і Францыя. Адпаведныя статыстычныя матар'ялы паказваюць наступнае: у Нямеччыне паводле даных перапісу 1925 году, усіх сельскіх гаспадарак было 5.096 тысяч, а ў Францыі па анкетным перапісу 1928 году ўсіх сельскіх гаспадарак было 5.495 тысяч. Гэта азначае, што ў пачатку 1931 году ў нашай краіне было калектывізавана больш сялянскіх гаспадарак, чымся іх налічваецца ў любой з памянёных краін, г. зн. у Нямеччыне і Францыі. Посьпехі калгаснага руху крута зьмянілі становішча ў вёсцы. У пачатку ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў калгасах была аб'яднана толькі вельмі неяўная частка сялянскіх гаспадарак. Доля валавой і таварнай прадукцыі калгасаў у агульнай прадукцыі сельскай гаспадаркі была тады нязначная. Пераважнае значэньне ў сельскай гаспадарцы мела дробная сялянская гаспадарка. У вёсцы яшчэ ня спыняўся рост капіталістычных элемэнтаў—кулацтва. За апошнія паўтара гады стварыліся карэнныя зьмены ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі. У сучасны момант рост капіталістычных элемэнтаў ня толькі прыпыніўся, але іх адносная вага ў народнай гаспадарцы зьніжаецца з месяцу ў месяц. Гэты працэс адбываецца такім чынам, што ні аб якім павялічэньні долі капіталістычных элемэнтаў у нашай народнай гаспадарцы і ні аб якіх надзеях на адраджэньне іх ранейшай гаспадарчай сілы ня можа быць і гутаркі. Зьніжэньне долі капіталістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы адбываецца поруч з магутным ростам сацыялістычных элемэнтаў ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, адначасова з усё большым ахопам калгасным рухам шырокіх мас сялянства. Пераход на шлях суцэльнай калектывізацыі ўсё новых і прытым буйнейшых раёнаў краіны вядзе ня толькі да сапраўднага ўздыму сельскай гаспадаркі—асноўных мас сялянства, але і кладзецца магільнай плітой на гіную чыя над цяжкай ступою мільённых мас рэшткі капіталізму.

Ня гледзячы на дапушчаныя ў мінулым годзе ў радзе раёнаў буйнейшыя памылкі ў калгасным будаўніцтве, ня гледзячы на тое, што маючыяся тут антысерадняцкія перагібы адыгралі сваю адмоўную ралю,—у другой палове 1930 году пачаўся ўжо новы прыліў сялян, беднякоў і сераднякоў у калгасы.

Дзякуючы своячасоваму выпраўленьню партыяй маючыхся перагібаў, новы прыліў у калгасы набывае зараз усё большы размах. Таму ў народнагаспадарчым пляне на 1931 год прадугледжана аб'яднаньне ў калгасы ня менш паловы ўсіх сялянскіх гаспадарак. У адносінах-жа такіх буйнейшых збожжавых раёнаў, як Паўночны Каўказ, Украіна (стэп), Ніжняе Паволжжа і Сярэдняе Паволжжа—мы разьлічваем у гэтым годзе на завяршэньне ў асноўным справы суцэльнай калектывізацыі гэтых раёнаў. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы будзе самым важным момантам у росьце сацыялістычных элемэнтаў нашай гаспадаркі ў 1931 годзе. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы, побач з іншымі важнейшымі задачамі трэцяга году пяцігодкі, дасьць магчымасьць пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім Саюзе.

З гэтага можна зрабіць той вывод, што ажыцьцяўленьне пастаўленых народна-гаспадарчым плянам на 1931 год задач будзе мець сусьветна-гістарычнае значэньне для справы сацыялізму. Ужо ў 1930 годзе па пасеўных плошчах калгасаў мы выканалі больш, чым падвойнае заданьне ўсяго пяцігадовага пляну.

У 1931 годзе мы ставім задачай прыкладна падвоіць нашы дасягненьні мінулага году. Няма чаго і гаварыць, што гэта будзе мець вялізарнае значэньне для забесьпячэньня выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады. Няма неабходнасьці падрабязна спыняцца на тым, як рост нашай гаспадаркі непасрэдна адбіваецца на палепшаньні матар'яльных умоў жыцьця народных мас. Адпаведныя даных апублікавана нямала і асноўныя з іх вядомы кожнаму рабочаму і шырокім пластом сялянства. Лепшым паказьнікам таго, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва блізкі і зразумелы рабочым і сялянскім масам—зьяўляецца рост удзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве на нашых фабрыках і заводах, а таксама саўгасах і калгасах, што выяўляецца ў першую чаргу ў няўхільным уздыме сацпаборніцтва і ўдарніцтва. У мінулым годзе сацспаборніцтва пачало перарастаць у новыя вышэйшыя формы—формы прыняцьця сустрэчнага грамфінпляну, што на практыцы азначае дабраахвотнае прыняцьце і ажыцьцяўленьне на справе павялічаных супроць устаноўленых дзяржаўнымі органамі, вытворчых заданьняў. Да пачатку 1931 году больш паловы рабочых і работніц ужо ўвайшло ў рады ўдарнікаў. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва расьце і ў саўгасах, таксама ўсё больш прышчапляецца і ў калгасах. Усё гэта ня толькі характарызуе вялічэньню посьпехаў нашага гаспадарчага будаўніцтва, але і паказвае на тое, як нашы посьпехі аказваюць ужо свой уплыў на становішча рабочых мас і калгасьнікаў на вёсцы.

З пасобных яскравых паказьнікаў палепшаньня становішча рабочых мас трэба раней за ўсё зазначыць на галоў нейшае—на ліквідацыю беспрацоўя. Яшчэ год назад у нас было звыш мільёна беспрацоўных, зараз-жа ў нашай краіне беспрацоўе ў асноўным ліквідавана. Больш таго, у радзе раёнаў адчуваецца значны недахоп у рабочай сіле і ў тым ліку недахоп у некваліфікаваных рабочых. Другім буйнейшым паказьнікам палепшаньня становішча рабочых мас зьяўляецца пасьпяховае правядзеньне 7-мігадзіннага рабочага дню. У 1931 годзе 7-мігадзінны рабочы дзень будзе праведзены ня толькі для ўсіх рабочых чыгуначнага транспарту, але і для 9/10 рабочых нашай прамысловасьці.

Далей, аб росьце заработку рабочых і служачых. З году ў год савецкая ўлада нязьменна праводзіць павялічэньне заработку. Гэта будзе мець месца і ў 1931 годзе. Павялічваецца заработак у прамысловасьці на 6 проц., на транспарце на 8 проц. Побач з падцягваньнем заработку нізка аплачаваемых пластоў рабочых, асабліва значэньне набывае павялічэньне заработку рашаючых для паліводства груп кваліфікаваных рабочых, а таксама і служачых. Трэба толькі паказаць на той факт, што павялічэньне заработку ўводзіцца ў нас пры адначасовым уводзеньні 7-мігадзіннага рабочага дню і ўстанаўленьні пяцідзённага тыдню (бесьперапынка) з рэгулярным днём адпачынку для рабочых і служачых кожны пяты дзень, каб процілегласьць жыцьця працоўных мас СССР і ў капіталістычных краінах была выкрыта з усёй поўнасьцю. Што-ж да меўшыхся ў апошнія часы выпадкаў затрыманьня выдачы заработку, дык гэткія зьявішчы павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Няма неабходнасьці спыняцца на іншых агульнавядомых паказьніках палепшаньня матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочых мас, досьць іх простага пералічэньня. Сюды адносяцца: рост жыльлёвага будаўніцтва для рабочых, далейшае палепшаньне спэцыяльнага фонду па палепшаньні быту рабочых, далейшае разгортваньне лячэньня рабочых у санаторыях на курортах і г. д. Апроч таго, для рабочых і служачых мае вялізарнае значэньне той факт, што фонд сацыяльнага страхаваньня дасягае сёлета значнай лічбы—2.138 мільёнаў рублёў, што перавышае лічбу фонду, якая намячалася для пятага году пяцігодкі. У адносінах да вёскі і ў асаблівасьці ў адносінах да вясковай беднаты, савецкая ўлада праводзіць штогод дзяржаўную дапамогу сялянскай гаспадарцы, якая ўсё пашыраецца. За апошні пэрыяд гэта дапамога і рознага роду бюджэты накіроўваюцца ў першую чаргу для падтрыманьня калгасаў. Усё гэта ў сваю чаргу ўжо адбілася на росьце пасеўных плошчаў і падвышэньні ўраджайнасьці ў сялянскіх гаспадарках і, раней усяго, у калгасах. Апошні сельска-гаспадарчы год у гэтых адносінах быў асабліва паказальным.

Нарэшце, вялізарнае эканамічнае і палітычнае значэньне мае палітыка цэн у савецкай уладзе. Пры росьце прыбыткаў гарадзкіх і вясковых мас пасьлядоўнае правядзеньне такой палітыкі цэн, якая (палітыка) выключае падвышэньне цэн на прамтавары і сельска-гаспадарчыя прадукты ў дзяржаўным каапэрацыйным гандлі, мае першаступнянёвае значэньне. У 1931 годзе гэты факт павінен знайсьці асабліва яскравы адбітак з прычыны таго, што вытворчасьць прамтавараў шырокага спажываньня, а таксама ўвесь фозьнічны зварот значна павялічыцца. Дапушчанае савецкай дзяржавай часковае падвышэньне цэн для буржуазных элемэнтаў на некаторыя прамтавары ажыцьцяўляецца без ніякага парушэньня вызначаных норм забясьпечаньня для працоўных і, бязумоўна, у асноўнай лініі савецкай улады ў гэтым пытаньні супярэчнасьцяй не заходзіцца.

Таксама трэба адзначыць, што лямманты буржуазнага друку наконт падрыву курсу нашага рубля, зьяўляецца ні чым іншым, як недарэчнай клусьнёй і б'юць яўна міма мэты. Гэтыя песенькі разьбіваюцца дашчэнту аб бясспрэчныя факты і раней за ўсё аб той факт, што цэны на пераважную масу тавараў шырокага спажываньня рэгулююцца дзяржавай, якая не дапускае якога небудзь падвышэньня гэтых цэн, а ў радзе выпадкаў і зьніжае гэтыя цэны. Роля-ж прыватнага рынку і спэкуляцыі прыватніка ў нашай краіне цяпер няўхільна занепадае. Тым ня менш, мы павінны і надалей працягваць барацьбу за ўмацаваньне савецкага рубля. Усе паданыя факты, характарызуючы няўхільнае палепшаньне матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочых і сялянскіх мас, даказваюць разам з тым зрабіць наступны вывад: посьпехі сацыялізму і ўзрастаючы ўплыў іх на становішча народных мас стваряюць прадпасылкі для новага гіганцкага росту актыўнасьці мас у сацыялістычным будаўніцтве, тым самым забясьпечваючы яшчэ больш буйныя посьпехі гэтага будаўніцтва ў далейшым.

Нашы задачы на баявых вучастках

Галоўнай і асноўнай задачай у трэцім годзе пяцігодкі зьяўляецца выкананьне народна-гаспадарчага пляну ў тым аб'ёме, у якім ён будзе прыняты партыяй і савецкай уладай. Мы ня толькі павінны дамагчыся поўнага ажыцьцяўленьня пастаўленых у гэтым пляне задач, але і дабіцца яго перавыкананьня, асабліва на важнейшых вучастках. Бясспрэчна таксама, што ажыцьцяўленьне заданьня аб ахопе калгасным рухам ня менш паловы сялянскіх гаспадарак зьяўляецца адным з самых асноўных задач 1931 году. Будзем памятаць аб тым, што выкананьне гэтых заданьняў будзе азначаць, што мы напэўна ажыцьцёвім на практыцы лёзунг: «Пяцігодка ў чатыры гады».

Пад сьцягам: «Пяцігодка ў чатыры гады» мы і павінны зараз будаваць нашы рады, павінны арганізоўваць масы для пераможнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі.

Апэл і мэталь

Ад ступені выкананьня праграмы па апалу гэтага году залежыць ажыцьцяўленьне вытворчай праграмы цалкам і перш за ўсё праграмы мэталю. А цяпер, у сувязі з разгортваньнем індустрыялізацыі краіны, патрэба ў павялічэньні вырабу мэталю, асабліва шпарка ўзрастае. Скарачэньне запасаў апалу і разам з тым вялізарны рост патрэбы ў апале робіць бязумоўным выкананьне ў тэрмін праграм па апалу. Поруч з гэтым, патрэбна максымальная эканомія ў выдаткаваньні апалу, а таксама жорсткая эканомія ў выдаткаваньні мэталю.

Транспарт

У 1931 годзе прыпадае вялізарнае павялічэньне работы ўсіх выглядаў транспарту, і перш за ўсё чыгуначнага, воднага. У адпаведнасьці з магутным ростам прадукцыі кругаварот павінен павялічыцца за адзін год амаль на 50 проц. Поруч з павялічэньнем кругавых перавозак значна падымаецца пасажырскі рух. Між тым сучаснае становішча на транспарце нельга прызнаць задавальняючым. Неабходна як-бы та ні было дамагчыся рашучага пералому ў рабоце нашага транспарту, забясьпечыць яму адпаведна падтрыманьне з боку ўсіх арганізацый рабочае клясы і правесьці сапраўднае палепшаньне арганізацыйнай справы ў гэтай адказьнейшай галіне народнае гаспадаркі. На транспарце таксама і ў апалавай прамысловасьці, нельга ніводнага дня мірыцца з сучасным становішчам. Трэба дамагчыся ў самы кароткі тэрмін рашучага зруху і ў той і ў іншай справе.

Вясеньняя пасеўная кампанія

У гэтым годзе мы будзем мець другі бальшавіцкі сеў. Падрыхтоўка да яго пачалася. Як і ў мінулым годзе, вясеньняя пасеўная кампанія мае ня толькі вялізарнае эканамічнае, але і вялікае палітычнае значэньне. Падрыхтоўку да вясеньняй кампаніі ўжо цяпер трэба зьвязаць з падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі. Але справа ня толькі ў своячасовым і поўным разгортваньні вырабу трактараў, камбайнаў і інш. ўборачных машын і ў вырабе патрэбных для іх запасных частак, але

ПАД АГОНЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ САМАКРЫТЫКІ

РАБОТУ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

Справаздачна-выбарчая кампанія гарсавету праходзіць нездавальняюча

Зрабіць рашучы пералом. Мабілізаваць выбаршчыкаў на бальшавіцкае правядзеньне выбарчай кампаніі, на барацьбу за генэральную лінію партыі, супраць усякіх ухілаў ад яе, на выкананьне баявой праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Работа Менскага гарсавету ў шэрагу важнейшых галін застаецца нездавальняючай

Рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б па дакладу Менскага Гарадзкога Савету

Бюра ЦК канстатуе шэраг дасягненьняў у рабоце Менскага Гарадзкога Савету, якія заключаюцца ў значным пашырэньні гарадзкой прамысловасьці, пасьпяховым выкананьні пляну другога году пяцігодкі, значным росьце рабочых кадраў, ліквідацыі беспрацоўя і падвышэньня матар'яльма-культурнага узроўню рабочых мас (рост заработнай платы, уцягненьне ў вытворчасьць іншых членаў сем'яў рабочых, разгортваньне жыльлёвага будаўніцтва і пашырэньне грамадзкага харчаваньня). У значным разгортваньні культурнага будаўніцтва, правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і актыўны ўдзел Гарсавету ў арганізацыі і пашырэньні сеткі ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, а таксама ў правядзеньні шэрагу мерапрыемстваў па палепшаньні дабрабыту гораду (пабудова трамваю, пашырэньне электрастанцыі, частковая каналізацыя і г. д.).

Аднак гэтыя дасягненьні зьяўляюцца зусім недастатковымі і работа Менскага Гарсавету ў шэрагу важнейшых галін застаецца нездавальняючай. Бюро ЦК адзначае наступныя буйныя недахопы ў рабоце Гарсавету:

а) пры наяўнасьці вагромністага ўздыму актыўнасьці рабочае масы г. Менску, масавая работа Гарсавету разгорнута надзвычайна слаба і яўна адстае ад масавай актыўнасьці рабочых. Ажыцьцяўленьне новых форм сувязі Гарсавету з шырокімі рабочымі масамі па прадпрыемствах (дэпутацкія групы, дэжурства членаў Гарсавету на прадпрыёмствах і інш.) яшчэ не зрушана з мёртвай кропкі; работа Гарсавету па ўцягненьні ў актыўную работу ўсіх членаў Гарсавету і ўтварэньні шырокага рабочага актыву вакол Гарсавету таксама зьяўляецца недастатковай.

Пры наяўнасьці вялізарнай актыўнасьці рабочых мас і ўздыму вакол асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва, Менскі Гарадзкі Савет яшчэ не стаў на сапраўднаму на чале актыўнасьці мас, не развярнуў адпаведнай работы па мабілізацыі пролетарскіх мас вакол асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва (выкананьне промфінпляну, падняцьцё і ўзмацненьне працдысцыпліны на прадпрыемствах, палепшаньне якасьці прадукцыі і г. д.) замест таго каб паставіць на першы плян сваёй штодзённай работы інтарэсы вытворчасьці і яе абслугоўваньня, Гарсавет вельмі часта заставаўся ў баку ад гэтых задач, не прымаў актыўнага ўдзелу ў іх вырашэньні і не забясьпечыў дастатковага кіраўніцтва. Усё гэта сьведчыць аб тым, што работа Менскага Гарсавету адстае ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, што карэнная перабудова ўсёй работы Гарсавету ў напрамку павароту тварам да вытворчасьці і ўдарніцтва працякае марудна.

б) Ня гледзячы на значнае будаўніцтва новых дамоў, тэмпы жыльбудаўніцтва адстаюць ад тэмпаў росту прамысловасьці і запатрабаваньняў працоўнага гораду. Рост працоўнага насельніцтва і пашырэньне вытворчасьці патрабуюць значнага павялічэньня праграмы жыльбудаўніцтва з боку Гарсавету і прамысловасьці, а таксама разгортваньня большай ініцыятывы з боку будаўнічай каапэрацыі.

в) Таксама зусім недастатковай зьяўляецца работа Менскага Гарсавету па дабрабыту гораду: электрастанцыя і водаправод працуюць з вялікімі перабоямі і патрабуюць карэннага палепшаньня, маставыя і тратуары не знаходзяцца ў належным становішчы, каналізацыйныя работы надта зацягнуліся, вучот і разьмеркаваньне жыльплошчы знаходзяцца ў хаатычным становішчы, непраяўлена дастаткова ініцыятывы па правядзеньні ў належны парадак паркаў і арганізацый культурнага здаровага адпачынку для рабочых, санітарнае становішча гораду ў цэлым застаецца усё яшчэ да гэтага часу нездавальняючым.

г) Адным з буйнейшых недахопаў у рабоце Гарсавету зьяўляецца недастатковае кіраўніцтва і мабілізацыя актыўнасьці членаў Гарсавету і ўсёй рабочай масы вакол задач па палепшаньні забесьпячэньня рабочага насельніцтва, па палепшаньні работы рабочае каапэрацыі. Гарсавет не забясьпечыў кіраўніцтва работай каапэрацыі ў галіне загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў для забясьпячэньня рабочых Менску. Арганізацыя прыгарадных жывёлагадоўчых гаспадарак вракавае марудна, што сьведчыць аб наяўнасьці некаторай недаацэнкі з боку Гарсавету ўсёй важнасьці прыгарадных гаспадарак, як аднаго з важнейшых сродкаў палепшаньня забесьпячэньня працоўных гораду, з боку Гарсавету ня прынята дастатковых мер па ліквідацыі чаргі ў лаўках і сталовых, не арганізован яшчэ рабочы кантроль над правільным клясавым разьмеркаваньнем прадуктаў і прамтавараў. Ня гледзячы на значнае пашырэньне сеткі сталовых апошняе нездавальняе запатрабаваньняў рабочых як з боку колькаснай, так асабліва якасьці адпушчаемых абедаў. Гарсавет не прыняў своячасова мер да забясьпячэньня дрыўмі гарадзкіх прадпрыемстваў, навучальных устаноў і працоўных М[illegible] з прычыны чаго мелі месца вя[illegible]я перабоі ў забесьпячэньні апалам. Усе гэтыя недахопы ў рабочым забесьпячэньні сьведчаць аб тым, што Гарсавет вызначае гэтаму важнейшаму пытаньню зусім недастатковую ўвагу і не пераключыўся яшчэ на абслугоўваньне запатрабаваньняў рабочых. Адзначаным буйнейшым недахопы ў рабоце Мен. Гарсавету могуць быць ліквідаваны толькі пры той умове калі Гарсавет па сапраўднаму забясьпечыць карэнную перабудову ўсёй сваёй работы, даб'ецца сапраўднага павароту да вытворчасьці і ўдарніцтва, калі Гарсавет забясьпечыць далейшую мабілізацыю пралетарскіх мас на барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі, на барацьбу з бюракратызмам і недахопамі, якія маюцца ў практыцы работы асобных зьвеньняў Гарсавету. Неабходна накіраваць усю ўвагу партыйнай арганізацыі на падвышэньне палітычнай ролі Гарсавету, як правадніка генэральнай лініі партыі.

Выходзячы з гэтага Бюро ЦК ставіць перад Гарсаветам на чарговы пэрыяд наступныя задачы:

1. Адным з важнейшых задач Гарсавету зьяўляецца разгортваньне масавай работы на прадпрыемствах і ўзмацненьне сувязі з шырокімі рабочымі масамі. Гарсавету неабходна шырока разгарнуць новыя формы работы, арганізаваць дэпутацкія групы на прадпрыемствах, наладзіць сыстэматычную работу з практыкантамі, забясьпечыць уцягненьне ўсіх членаў Гарсавету і шырокага рабочага актыву ў першую чаргу ўдарніжаў да актыўнага ўдзелу ва ўсёй рабоце Гарадзкога Савету асабліва зьвярнуць увагу на далейшую мабілізацыю мас на рашучую барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі, на барацьбу з бюракратызмам у рабоце асобных зьвеньняў Гарсавету, паўней скарыстоўваючы новыя формы рабочага кантролю над работай савецкага апарату (пасылка рабочых брыгад для праверкі работы устаноў, рэгулярная справаздачнасьць савецкіх устаноў перад рабочай масай, шефства прадпрыемстваў над установамі і г. д.). Асаблівую ўвагу Гарсавету зьвярнуць на далейшае разгортваньне і ўзмацненьне шэфскай работы.

2. Гарадзкому Савету ў карацейшы тэрмін дабіцца рашучага пералому і забясьпечыць сапраўдную перабудову ўсёй сваёй работы, ні ў якім разе не дапушчаючы адставаньня ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гарсавету неабходна дабіцца ўзмацненьня кіраўніцтва работай гарадзкой прамысловасьцю, паскарэньня і палепшаньня новага будаўніцтва, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на разгортваньне прадпрыемстваў, якія вытвараюць будаўнічыя матар'ялы (цагельні, выраб будаўнічых дэталяў і інш.). Гарсавету ў далейшым прыняць больш актыўны ўдзел у мабілізацыі мас вакол выкананьня прамфінпляну 3-га году пяцігодкі, мабілізуючы вакол гэтае задачы членаў Гарсавету, увесь савецкі актыў і ўсю рабочую масу, рэгулярна ставіць на абгаварэньне Гарсавету пытаньне выкананьня прамфінпляну і работы гарадзкой прамысловасьці.

3. Улічваючы значны рост г. Менску і далейшае пашырэньне вытворчасьці Гарсавету неабходна значна павялічыць тэмпы жыльлёвага будаўніцтва як па лініі Гарсавету, так і прамысловасьці. Прыняць меры да рацыянальнага скарыстаньня сродкаў да паскораньня і патаньня жыльлёвага будаўніцтва, а таксама значнага паселеньня дзейнасьці і разгортваньня ініцыятывы будаўнічай каапэрацыі. Адначасова з гэтым, Гарадзкому Савету прыняць усе неабходныя меры да захаваньня маючагася жыльлёвага фонду, наладзіць поўны вучот і правільнае разьмеркаваньне кватэр, задавальняючы ў першую чаргу рабочых і камандны склад Чырвонай арміі.

4. Гарадзкому Савету зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне задач па ўзмацненьні і палепшаньні забясьпечаньня рабочых, Чырвонай арміі і ўсіх працоўных Менску прадуктамі харчаваньня і грамадзкім харчаваньнем. Для гэтага неабходна больш актыўна ўдзельнічаць і кіраваць разгортваньнем прыгарадных гаспадарак, канчаткова ўрэгуляваць да пачатку вясеньняй сяўбы пытаньне аб адводзе зямель для іх арганізацыі, прыняць меры да ўзмацненьня загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў, забясьпечыць далейшае пашырэньне сеткі сталовых на прадпрыемствах і ў горадзе і скančэньне будаўніцтва новых сталовак і фабрыкі-кухні ў самы кароткі тэрмін з такім разьлікам, каб ахапіць у асноўным усіх рабочых гарадзкой прамысловасьці і транспарту і значную частку членаў сям'і рабочых грамадзкім харчаваньнем, зьвярнуць асаблівую ўвагу на палепшаньне якасьці абедаў, на зьліквідаваньне чаргі ў сталоўках і палепшаньне абслугоўваньня рабочага спажыўца. Гэта можа быць дасягнута пры тых умовах, калі Гарсавет узмоцніць кіраўніцтва ўсёй работай каапэрацыі, забясьпечыць дастатковую дапамогу рабочай каапэрацыі і мабілізуе ўвесь савецкі актыў для ажыцьцяўленьня рабочага кантролю над рабочай каапэрацыяй.

5. Гарадзкому Савету забясьпечыць правядзеньне ў бягучым годзе шэрагу мерапрыемстваў па палепшаньні дабра быту гораду. Прыняць усе меры да забесьпячэньня бесперабойнага абслугоўваньня працоўных сьветам і вадой. Надыходзячы летні сэзон скарыстаць для пабудовы маставых у прылегаючых да фабрык, заводаў, да чыгуначных станцый вуліцах; распрацаваць у бліжэйшы час пытаньне аб пабудове ўдасканаленых маставых з такім разьлікам, каб з вясны ўжо прыступіць да перабрукаваньня вуліц і тратуараў, устанавіць сталы кантроль над санітарным становішчам гораду, а таксама правесьці шэраг мерапрыемстваў да забясьпечаньня здаровага і культурнага адпачынку для рабочых: прыступіць да пабудовы парку «культуры і адпачынку», пабудаваць дом адпачынку для рабочых ударнікаў. Адначасова з гэтым Гарадзкому Савету разгарнуць работу па плянаваньню гораду такім тэмпам, каб скончыць гэту работу на працягу бліжэйшых 2-х год.

6. Гарсавету не паслабляць сваёй увагі да задач культурнага будаўніцтва, прыняць меры да палепшаньня жыльлёвых умоў масавай школы, разгарнуць шырэй школьнае будаўніцтва ў горадзе, забясьпечыць поўнае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня ў гэтым годзе, ліквідацыі нясьменнасьці сярод рабочых і палепшаньню матар'яльна-бытавых умоў студэнцтва.

Гарсавету забясьпечыць цьвёрдае і пасьлядоўнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, прыняць усе захады да ўзмацненьня работы на беларусізацыі апаратаў і абслугоўваньні на роднай мове іншых нацыянальнасьцей (яўрэяў, рускіх, палякаў, татар, латышоў і інш. нацыянальнасьцей), вядучы рашучую барацьбу з усякага роду скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі, рашуча змагаючыся з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай, а таксама праводзячы рашучую барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў.

7. Адным з важнейшых задач Гарсавету зьяўляецца мабілізацыя савецкага актыву і правядзеньне шэрагу практычных мерапрыемстваў па забясьпечаньні актыўнага ўдзелу гарсавету ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспарадкі і ўзмацненьне пралетарскага ўплыву на вёску. Лічачы работу Гарсавету ў гэтай галіне нездавальняючай, Бюро ЦК даручае Гарсавету мабілізаваць увагу ўсяго савецкага актыву да задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, шырэй разгарнуць шэфскую работу і палепшыць зьмест гэткай. Наладзіць шчыльнейшую сувязь Гарсавету з сельскімі саветамі і іншымі арганізацыямі вёскі, прымаючы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для вёскі.

Даручыць Аддзелу Агітацыі і мас. камп. ЦК і фракцыі ЦВК дэталёва рас працаваць пытаньне аб абслугоўваньні Гарсаветамі вёскі і ўнесьці на Сакратарыят.

8. Даручыць фракцыі Гарсавету распрацаваць на аснове данай пастановы плян вытворчых мерапрыемстваў і ўнесьці на разгляд СНК.

9. Цэнтральным газэтам больш паўней чым да гэтага часу і сыстэматычна асьвятляць работу Гарсавету.

10. Узмацненьне ваеннай небясьпекі, асабліва становішча Менску патрабуе значнай увагі з боку Гарсавету да задач узмацненьня абароназдольнасьці Гарсавету неабходна аказаць усямерную дапамогу Асоавіяхэму ў разгортваньні яго работы, праяўляць мак сымальную чуласьць і ўвагу да запатрабаваньняў Чырвонай арміі, да палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў Чырвонай арміі і камандзнага складу (забясьпечаньне кватэрамі, арганізацыя сталовак, камунальнае абслугоўваньне і санітарна-гігіенічнае абслугоўваньне чырвонаармейцаў). Пытаньне дапамогі Чырвонай арміі, забясьпечаньне цеснай сувязі рабочых г. Менску з часьцямі Чырвонай арміі, разгортваньне і палепшаньне садружнай работы, павінны заняць вялікае месца ў рабоце Гарсавету.

11. Улічваючы выключнае значэньне чарговай справаздачна-перавыбарчай кампаніі Саветаў, Гаркому і ўсёй гарадзкой партыйнай арганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на пытаньне мабілізацыі рабочых і ўсіх працоўных на вокал гэтай важнейшай кампаніі. Гарадзкому Савету і Гарпартыйным арганізацыям забясьпечыць стопроцантную явку рабочых, жон рабочых і ўсіх працоўных на справаздачна-перавыбарчыя сходы Гарсавету, разгарнуць шырокую самакрытыку зьнізу, накіраваць агонь пралетарскай самакрытыкі на больш глыбокае ўскрыцьцё ўсіх недахопаў, бюракратызму і апартуністычных скажэньняў лініі партыі ў практыцы работы асобных зьвеньняў Гарсавету, забясьпечыць далейшае палепшаньне складу Савету высоўваючы новыя пралетарскія кадры з лепшых рабочых і работніц ударнікаў.

Зрабіць рашучы пералом у справаздачна-перавыбарчай кампаніі Менскага гарсавету

Аб ходзе справаздачнай кампаніі Менскага гарсавету

ПАСТАНОВА БЮРО МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ КП(б)Б.

1. Ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі Гарсавету сьведчыць аб тым, што з боку ячэек КП(б)Б, ФЗМК, ЦП саюзаў і Гарсавету яшчэ не дасягнута неабходнага пералому ў справе мабілізацыі рабочых і служачых вакол правядзеньня гэтай кампаніі, як важнейшай палітычнай кампаніі. Зрывы 28-мі сходаў сьведчаць аб безадказнасьці шэрагу ячэек КП(б)Б і ФЗМК у выкананьні важнейшых дырэктыў партыі аб яўнай палітычнай недаацэнцы справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

2) Прасіць Гар[illegible]КК у 4-х дзённы тэрмін прыцягнуць да партыйнае адказнасьці вінаўных у зрыве паказаных сходаў.

3) Абавязаць парт'ячэйкі зрабіць рашучы пералом у правядзеньні справаздачнай кампаніі, забясьпечыць 100-процантны ўдзел рабочых і служачых у кампаніі, мабілізуючы актыўнасьць вы баршчыкаў у суадпаведнасьці з рашэньнямі сьнежаньскага Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) на барацьбу за павялічэньне ролі саветаў у практычным ажыцьцяўленьні генэральна лініі партыі на барацьбу з канкрэтнымі праявамі правай практыкі, «левых» загібаў, з бюракратычнымі скажэньнямі ў рабоце Гарсавету, падвергнуўшы шырокай крытыцы ўсю дзейнасьць Гарсавету.

4) Дабіцца прыкладнасьці камуністаў і камсамольцаў па ўздыму ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі Гарсавету. У 3-х дзённы тэрмін абгаварыць на пазачарговых сходах ячэек пытаньне падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі і аб ходзе кампаніі на кожным прадпрыемстве і ўстанове.

5) Разгарнуць сапраўднае сацспаборніцтва за лепшае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі Гарсавету паміж прадпрыемствамі і ўстановамі.

6) Прапанаваць парт'ячэйкам правесьці асобную працу сярод работніц і жонак рабочых аб іх удзеле ў кампаніі, фракцыям саюзных органаў, Гарсавету і ЖАКТ'аў забясьпечыць на час кампаніі бесперабойную работу бытавых і дзіцячых устаноў і арганізацыю часовых у часе перавыбарчай кампаніі бытавых устаноў.

7) Друкаваная справаздача Гарсавету ў радзе месц не адпавядае рашэньню Бюро ЦК ад 26-га сьнежня па дакладу менскага Гарсавету. Справаздача Гарсавету не прасякнута самакрытыкай дзейнасьці Гарсавету, не выяўляе перад рабочымі канкрэтнае скрыўляе клясавай лініі, факты праваапартуністычнай практыкі, «левых» загібаў пасобных зьвеньняў саванараргіту, зусім не асьвятліла працу ў галіне ажыцьцяўленьня нацпалітыкі, у не ажыцьцяўленьня формулёўкі (аб вайне, наступленьні буржуазіі). Справаздача Гарсавету такім чынам не мабілізуе, не завастрае ўвагі рабочых на канкрэтныя недахопы ў рабоце Гарсавету, не высоўвае практычных задач стаячых перад Гарсаветам, на падставе рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове работы Саветаў. Складаньне і выданьне такой справаздачы Бюро Гаркому расцэньвае як грубую палітычную памылку з боку фракцыі Гарсавету.

Бюро адзначае асаблівую недапушчальнасьць выданьня справаздачы без абмеркаваньня яе напярэдня на фракцыі і Прэзыдыуму Гарсавету, што сьведчыць аб безадказнасьці кіраўніцтва Гарсавету да складаньня такога важнага палітычнага дакумэнту. Пытаньне аб памылках у гэтых адносінах тав. Аксючыца абгаварыць на наступным пасяджэньні Бюро Г. К.

Бюро абавязвае фракцыю Гарсавету ўнесьці ў 2-х дзённы тэрмін неабходныя папраўкі і дадаткі да справаздачы.

Склікаць на 8-е студзеня 1931 г. інструкцыйную нараду дакладчыкаў для правільнай арыентацыі іх аб характару справаздачы Гарсавету перад выбаршчыкамі.

8. Абавязаць ячэйкі разгарнуць падрыхтоўку да выбараў Гарсавету, забясьпечыўшы на справе пасылку ў саавет лепшых ударнікаў-рабочых, праверaных актывістаў, здольных змагацца за правядзеньне генэральнае лініі партыі ў рабоце Гарсавету.

9. Агітмасаваму аддзелу правесьці канкрэтныя масавыя мерапрыемствы, забясьпечваючыя пасьпяховы ход кампаніі.

10. Пастанову апублікаваць у друку.

Дакумант, які сьведчыць аб клясавой блізарукасьці

Рабочая кляса Савецкага Саюзу, у тым ліку рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з бяспрыкладным у гісторыі чалавецтва гераізмам і настойлівасьцю будуе сацыялізм.

Сусьветны імпэрыялізм напружвае ўсе свае сілы для таго, каб сарваць пераможны сацыялістычны наступ, каб зьнішчыць першую ў сьвеце краіну пралетарскай дыктатуры.

Працэс «прампартыі», выкрытае шкодніцтва ў важнейшых галінах нашай гаспадаркі, выкрытая контр-рэвалюцыйная група беларускіх нацдэмаў —выкрылі з усёй яскравасьцю тыя агідныя замыслы і плыны нашых сьмяротных клясавых ворагаў, якія разьлічваюць на скіданьне дыктатуры пралетарыяту і рэстаўрацыю капіталізму ў нас, у краіне бацька/шчыны сусьветнага пралетарыяту.

Краіна пралетарскай дыктатуры ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі ми заняраем пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР. Непарыўны ўздым энтузіязму рабочых мас, сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчны прамфінплян забясьпечылі ў другім годзе пяцігодкі перавыкананьне заданьняў па ўсіх рашаючых вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва, зрабілі рэальным лёзунг высунуты рабочай клясай «пяцігодка ў чатыры гады».

Вялізарныя посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва дасягнуты дзякуючы няўхільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, бязьлітаснай барацьбой з кулацтвам, якое ліквідуецца на базе суцэльнай калектывізацыі і кулацкай агентурай унутры партыі—з правымі і «левымі» апартуністамі, вялікадзяржаўнымі шавіністамі (галоўная небясьпека на даным этапе), контр-рэвалюцыйнымі нацдэмамі і шавіністымі розных колераў.

Разгорнуты сацыялістычны наступ па ўсім фронце выклікае шалёнае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў, якія ў прадсьмяротных сударгах усімі сіламі і сродкамі імкнуцца адцягнуць свой канец.

Рост сацыялізму ў нашай краіне натхняе на барацьбу супроць капіталізму пралетарыяту ўсяго сьвету. Здуўленая ціскамі выключна жорсткага крызісу ўсёй капіталістычнай сыстэмы, у дарэмных спробах выратаваць імпэрыялізм ад няминучага краху, капіталістычны сьвет вядзе наступ на рабочую клясу, шалёна рыхтуецца да нападу на СССР.

У гэткіх абставінах праходзіць у нас—у СССР і БССР важнейшая палітычная кампанія—перавыбары Саветаў.

Перад намі справаздача Менскага Гарсавету да перавыбараў савету 13 скліканьня. У сваёй уступнай частцы, якая малюе (лепш сказаць—павінна паказаць) тыя складаныя абставіны, у якіх праходзіла праца Гарсавету,—прэзыдыум Гарсавету імкнецца даць палітычны аналіз пэрыяду яго працы.

У гэтым уступленьні мы чытаем: «Праз увесь час міжнародная буржуазія не пакідае думку, што з таго тупіка, у якім яна знаходзіцца і ў якія яе завяла асабліва сусьветная вайна, можна выйсьці шляхам інтэрвэнцыі Савецкага Саюзу, шляхам зьнішчэньня дыктатуры пралетарыяту ў Савецкім Саюзе. Яшчэ на сёньняшні дзень міжнародная буржуазія не перастае рыхтавацца да нападу на Савецкі Саюз: бомба ў нашым паўнамоцным прадстаўніцтве (Польшча), вутэпаўшчына (Францыя), дэмпінг (ва ўсіх капіталістычных краінах), кіраўніцтва і фінансаваньне контр-рэвалюцыйнай арганізацыі (прам партыя) на тэрыторыі Савецкага Саюзу—усё гэта пацьвярджае зацею нападу на Савецкі Саюз» (стар. 4).

Акрамя палітычнай блытанасьці, у гэтай вытрымцы, Гарсавет даводзіць аб кіраўніцтве замежнай буржуазіяй «прам партыі» падаючы гэта так, як быццам гэты выпадак зьяўляецца выключна адзіным. А ці ня чуў Гарсавет аб групе «контр-рэвалюцыйных беларускіх нацдэмаў—Некрашэвічаў, Лёскаў, Лас тоўскіх і інш.,—гэтых непасрэдных лёкаяў польскага фашызму, агентаў польскай дэфэнзывы, якія імкнуліся нізрынуць савецкую ўладу ў БССР, зрабіць Беларусь калёніяй польскага фашызму.

Няўжо міма Гарсавету прайшоў мільённы пратэст працоўных мас Беларусі супроць шкодніцкай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці беларускіх нацдэмаў—**агентаў міжнароднай інтэрвэнцыі?**

Гарсавет у сваёй справаздачы недаацаніў палітычнай сутнасьці барацьбы з контр-рэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам. Гарсавет не зразумеў, што «выкрытая Дзяржаўнай Палітычнай Управай Беларускай ССР контр-рэвалюцыйная група беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якая зьяўляецца агентурай фашысцкіх інтэрвэнтаў, трасцама імкнулася да рэстаўрацыі капіталізму ў БССР, скіданьня пралетарскай дыктатуры і ўстанаўленьня дыктатуры абшарнікаў і капіталістаў» (з пастановы III Сэсіі ЦВК БССР па дакладу т. Галадзеда).

Усё гэта для Гарсавету быў пусты гук. Гарсавет ўмудрыўся на працягу ўсёй сваёй друкаванай справаздачы (101 старонка) ніводнага разу навят не спамянуць слова **нацыянал-дэмакрат**. Гэтае маўчаньне зьяўляецца на нашай думцы больш чым красамоўным. Наогул у справаздачы ні слова не сказана аб тым, як Гарсавет праводзіў на справе Ленінскую нацпалітыку.

* * *

Другім разьдзелам у практычнай частцы справаздачы Гарсавету ідзе прамысловасьць. У гэтым разьдзеле справаздачы Менскі Гарсавет адзначае толькі тое, што «нараду з уцягненьнем рабочых у сацыялістычнае будаўніцтва **праводзілася работа па кваліфікацыі іх, дзякуючы чаму зарплата іх стала паступова ўзрастаць і падняцца прадукцыйнасьць працы**» (стар. 8). Гарсавет не знайшоў нават патрэбным сказаць аб ударніцтве, сацспаборніцтве, аб сустрэчных прамфінплянах, аб вытворчых манэўрах, якія ахапілі значную частку прадпрыемстваў гораду.

Справаздача моўчкі абыйшла факты права-апартуністычнай практыкі ў выкананьні пляну другога году пяцігодкі на асобных прадпрыемствах (гарбарня «Бальшавік», дзе было адноўлена кіраўніцтва і інш.) і савапараце (Гарфо і інш.). Міма Гарсавету прайшоў вялікі ўздым энтузіязму пралетарыяў чырвонай сталіцы БССР, вынікам чаго і зьяўляецца той факт, што мы на важнейшых паказчыках перавыканалі прамфінплян, што мы з посьпехам выканалі па асноўных паказчыках плян асобнага кварталу.

Мы гэтыя посьпехі маем дзякуючы няўхільнаму правядзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, рашучай барацьбе з усялякімі ўхіламі ад яе і ў першую чаргу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву, сустрэчным прамфінплянам, энтузіязму рабочых мас, накіраваных на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Зусім незадавальняючым зьяўляецца таксама і той разьдзел у справаздачы, дзе гаворыцца аб рабочым забесьпячэньні.

Гарсавет не знайшоў бальшавіцкай мовы, каб адкрыта, самакрытычна сказаць аб тых прарывах, якія мелі месца ў рабочым забесьпячэньні.

«Аднак,—прымірэнча гаворыцца ў справаздачы—трэба сказаць, што ЦРК ня зусім справіўся з пастаўленымі перад ім задачамі» (ст. 58).

У той час, калі кіраўніцтва ЦРК зьменена, калі МЦРК ня справілася з ускладненымі на яе задачамі і калі апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) прызнаў «работу Цэнтрасаюзу і органаў спажывецкай каапэрацыі на месцах нездавальняючай».

Як разумець гэтую супярэчнасьць паміж пастановамі нашай партыі і справаздачай Гарсавету, выданай некалькі дзён таму назад.

У разьдзеле аб народнай асьвеце мы бачым, як ідзе будаўніцтва беларускай культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па сваім зьмесьце, бачым вынік культурнага будаўніцтва першых двух год сацыялістычнай пяцігодкі.

У гэтым разьдзеле нічога ня сказана аб клясавай барацьбе, якая адбывалася і адбываецца на гэтым фронце. Гарсавет умудрыўся і ў гэтым разьдзеле ніводнага слова не сказаць аб тых вылазках ярлікадзяржаўнага шавінізму, якія мы мелі ў радзе культурна-асьветных устаноў гораду. Гарсавет ніводнам словам не абмовіўся аб імкненьнях контр-рэвалюцыйных нацдэмаў скарыстаць у сваіх мэтах культурна-асьветныя ўстановы, ніводнага слова няма і аб меўшых месца антысэмітскіх вылазках клясавага ворага, аб правах шавінізму іншых колераў.

Гарсавет ня лічыў патрэбным сказаць, у якім становішчы знаходзіцца справа беларусізацыі, Гарсавет ня ўлічыў, запамятаваў пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Мы адзначылі толькі некаторыя найбольш грубыя палітычныя памылкі ў справаздачы Менскага Гарсавету.

Мы лічым, што справаздача Гарсавету не адпавядае сапраўднаму становішчу рэчаў. Яна не адзначае тых буйных дасягненьняў, якіх дамогся пралетарыят чырвонага Менску пад кіраўніцтвам КП(б)Б. Гэтая справаздача павінна быць карэнным чынам перагледжана, палітычна выпраўлена і дапоўнена. Яна павінна адпавядаць нашым сапраўдным сацыялістычным дасягненьням.

У такім выглядзе, у якім справаздача пададзена зараз—яна зьяўляецца апартуністычным дакумэнтам.

Р. Іжок.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Заклікаем у калгас

Калгас „Камунар Магілеўшчыны" прыкладам сваёй работы паказвае перавагі калектыўнае гаспадаркі

Калгас «Камунар Магілеўшчыны» арганізаваўся ў 1929 г. у чэрвені, ў ліку 96 гаспадарак з трох вёсак, Студзенскага сельсавету (Савінічы, Студзянец і Аляксандраўка). Да часу засеву азімага кліну 1930 г. калгас налічваў ужо 348 гаспадарак, з іх беднякоў—184, сераднякоў—156 і батракоў—8. За час уборачнай кампаніі ўлілося яшчэ 15 новых гаспадарак.

У карыстаньні калгасу маецца раллі—1001 га, гародаў—10 га, сенажаці 1386 га, лесу 2496 га, саду 55 га і няўжытку 242 га. Абагулены статак складаўся з 269 коняй, з 32 галоў маладняка, з 118 кароў, з 37 падцёлкаў і нецеляў, з 12 быкоў, з 124 цялят, з 30 сьвінаматак, з 24 падсьвінкаў, з 4 кнароў, з 69 парасят.

Калгас забясьпечан 15 трактарамі, 1 жняркай- снапавязалкай, 5 жняркамі-самаскідкамі, 2 малатарнямі, 2 сеялкамі дыскавымі, 3 касаркамі, 1 бульбакапалкай—трактарнай і інш. машынамі.

Сёлета пабудаваны 4 сьвірны для збожжа ўмяшчальнасьцю 40 тысяч пудоў, адна кавальская майстэрня, адна сталоўка, адна вежа сілосная, пяць сілосных ям, адзін сьвінарнік і будынак для праўленьня калгасу. Намячаецца падкласьці падмуркі для зімовага будаўніцтва 2-х сьвінарнікаў і аднэй аборы.

Сёлета калгас атрымаў валавога збору збожжа: азімага жыта—3500 цнт., яравога збожжа—6500 цнт., бульбы—25.000 цнт., фуражу—5170 пуд. і гародніны ў рублёх—на 10585 руб. З валавога збору калгас здае дзяржаўна паміж членамі калгасу.

Мы, калгасьнікі «Камунара Магілеўшчыны», упэўнены ў перавазе калектыўнай гаспадаркі. Мы зварочваемся да ўсіх аднаасобнікаў—батракоў, беднякоў і сераднякоў з заклікам на калгасны шлях пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Клімавіцкі р. МАРЧАНКА С.

Ганьба дэзэртырам справаздачна-выбарчай

Заўчора адбыўся справаздачны сход гарсавету ў абутковай майстэрні гарсавету, разам з трупкомам дробных прадпрыемстваў саюзу гарбароў і беспрацоўнымі гэтага саюзу. Аднак яўка выбаршчыкаў на гэтым вучастку была зусім нездавальняючай: з 314 выбаршчыкаў, якія павінны былі зьявіцца на гэты сход зарэгістравалася ў сьпіс толькі 112, а калі потым пералічылі яшчэ раз, дык аказалася што ня было і гэтага.

Аднак, ня гледзячы на гэта, сход усё-ж такі адбыўся і абгаварэньне справаздачы гарсавету прайшло дасьць актыўна.

Зьявіўшыся на выбарчы сход рабочыя былі вельмі абураны нядбайнымі адносінамі той часткі выбаршчыкаў, якая не зьявілася на выбарчы сход і ня рашуна асудзілі гэта ганебнае зьявішча. Агульны сход пастанавіў патрэбаваць ад незьявіўшыхся выразнага ставіць пытаньне перад прафарганізацыйнай лініі тым, хто не зьявіўся на сход бяз уважлівых прычын.

Трэба адзначыць, што на сход не зьявілася і **частка партыйцаў.**

З такімі нядбайнымі адносінамі да важнейшай палітычна-масавай кампаніі, як перавыбары гарсавету тоэба рашуча скончыць. Ганьба тым выбаршчыкам, якія нядбайна адносяцца да гэтай справы.

Н. Ф.

„Мне, ведаеце, няма часу"...

У Гомельскім райкаапсаюзе ўсё было спакойна. Нават машынка не тараторыла, а шамацела. На заданае члену праўленьня тав. Акімаву пытаньне, ці складзены плян правядзеньня веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1931 г.,—быў скакойны адказ:

— Ня маем ніякіх інструкцый і кантрольных лічбаў. Атрымаем—тады будзем складаць.

І ўжо пасьпешна дадаў: «Што вы хацелі, мне, ведаеце, ня

145 МІЛЬЁНАЎ РУБ. БУДЗЕ УЛОЖАНА У 1931 Г. у сельскую гаспадарку БССР

НОВЫМ МАГУТНЫМ КАЛГАСНЫМ ПРЫЛІВАМ СУСТРЭНЕМ ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ

УЗЬНІМЕМ ХВАЛЮ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ САВГАСАЎ, КАЛГАСАЎ І МТС

Разгорнем баявую падрыхтоўку да вясны

У сваіх дырэктыўных паказаньнях аб веснавой сяўбе партыя і ўрад з асаблівай дакладнасьцю завастрылі ўвагу на радзе задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў сувязі з трэцім рашаючым годам пяцігодкі. Пасеўная кампанія другой бальшавіцкай вясны адыгрывае рашаючае значэньне ў справе ажыцьцяўленьня задач трэцяга году пяцігодкі. Вось чаму, справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых органаў калгасаў, складаньня вытворчых плянаў калгасаў, падрыхтоўка да вясеньняга севу набываюць асабліва важнае палітычнае значэньне. Надыходзячая бальшавіцкая вясна павінна стаць вясной масавага паходу за новы калгасны прыліў, за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва, як класы.

Веснавая пасеўная кампанія будзе ад бывацца ў абставінах жорсткай клясавай барацьбы на вёсцы. Кулацтва, якое ліквідуецца як кляса на аснове суцэльнай калектывізацыі, шалёна супраціўляецца і будзе супраціўляцца росту сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Таму згрунтаваньне калганых, батрацка-бедняцкіх і серадняцкіх мас вакол генэральнае лініі партыі і ў правядзеньні вясеньняга севу зьяўляецца аднэй з першачарговых задач бальшавіцкай вясны.

Мінулы год зьявіўся годам рашаючага пералому. Сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы БССР ахапіў ужо 19,5 проц. усёй пасеўнай плошчы пры 30 проц. таварнасьці сельскае гаспадаркі рэспублікі. Плян другой бальшавіцкай вясны высоўвае асабліва адказныя задачы ў галіне спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі Беларусі.

Па дакладу Наркамзема БССР калегія Саюзнага Наркамзему прыняла пастанову, у якой адзначае, што рэканструкцыя сельскае гаспадаркі Беларусі павінна весьціся на аснове ільнянай і малочнай вытворчасьці паўночнай часткі рэспублікі, малочна-жывёлагадоўчай і сьвіноводзтва—ў астатніх частках, а таксама—разьвіцьця канапель у некаторых паўднёвых раёнах. Пасеўная плошча павінна быць пашырана ў 1931 годзе на 9 проц. Максымальная ўвага павінна быць надана разьвіцьцю кармовай базы шляхам травасеяньня, палепшаньня лугоў, выпасаў і разгорнутай праграмы сіласаваньня.

Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы павінна павялічыцца ў параўнаньні з 1930 годам на 15 проц., сьвіное пагалоўе—на 50 проц.

Агульны разьмер капітальных укладаньняў у рэканструкцыю сельскае гаспадаркі Беларусі на 1931 год вызначана ў 145 мільёнаў руб.

У сувязі з гэтым на земорганы ўскладаецца непасрэдная адказнасьць за максымальна-інтэнсыўнае скарыстаньне ўсіх гэтых уладаньняў і бязумоўнае ажыцьцяўленьне ўсяе вытворчае праграмы, абумоўленай маштабам гэтых капітальных затрат.

Друкуемая ў сёньнішнім нумары «Савецкай Беларусі»—пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі кіруючых органаў калгасаў і пастанова СНК БССР аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі—ўскладаюць на раённыя кіруючыя органы адказнейшыя задачы па падрыхтоўцы і баявому правядзеньню другой бальшавіцкай вясны. Трэба неадкладна па баявому прыступіць да практычнага абгаворэньня пляну вясеньняга севу з прыцягненьнем усяе калгаснае і бядняцка-серадняцкае масы. Пляны вясеньняга севу да шырокіх мас павінны быць даведзены своячасова. Вызначаныя пастановай СНК тэрміны для правядзеньня раду практычных мерапрыемстваў—арганізацыя насенных фондаў, ачыстка насеньня, рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару і машын, збор насенных калгасных фондаў—гэтыя мерапрыемствы павінны быць праведзены поўнасьцю і ў тэрмін.

Барацьба за суцэльную калектывізацыю, за магутны прыліў у калгасы, пашырэньне пасеўных плошчы, уздым ураджайнасьці, пашырэньне плошчы тэхкультур, пашырэньне садова-гародняй гаспадаркі, спэцыялізацыя раённаў, вырашэньне кармовай базы—павінны заняць цэнтральнае месца другой бальшавіцкай вясны.

Няпрымірымай барацьбой з правым і «левым» апартунізмам, рашучым наступам на кулака пад кіраўніцтвам КП(б)Б другая бальшавіцкая вясна ста не магутным масавым паходам за новы калгасны прыліў, за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі.

УСТУПАЮЦЬ У КАЛГАС

Мабілізаваць актыўнасьць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас

на правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў калгасах

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б АД 6-I—31 г. АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ КАЛГАСАЎ.

З 15-га студзеня да 20-га лютага 1931 г. праводзіцца справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых органаў калгасаў. Гэта кампанія павінна зьявіцца генэральным агладам усяе працы калгасаў і усёй калгаснай сыстэмы ў выкананьні ускладзеных партыяй задач па замацаваньні існуючых калгасаў і далейшым разгортваньні калгаснага руху а, таксама праверкай таго наколькі партыйныя арганізацыі сталі на чале кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам, наколькі яны здолелі арганізаваць і стаць на чале новага калгаснага прыліву.

Падводзячы вынікі калектывізацыі, вынікі першага гаспадарчага году, выкарыстоўваючы усе формы масавай работы для паказу дасягненьняў калгаснага руху і перавагі калектыўнае гаспадаркі над дробнай аднаасобнай, партарганізацыі павінны разгарнуць бальшавіцкімі тэмпамі работу па мабілізацыі актыўнасьці калгасьнікаў, калгасьніц і аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў на замацаваньне дасягнутых посьпехаў у галіне калектывізацыі на разгортваньне работы на падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай веснавой сяўбы і ажыцьцяўленьня вытворчай праграмы вызначанай на 1931 год.

Асноўнымі задачамі, якія павінны быць пастаўлены і ажыцьцёўлены ў час справаздачна-перавыбарчай кампаніі, зьяўляюцца:

1. Барацьба з правым апартуністычным практыкам, ухасьцізмам і стаўкай на самацёк у калгасным будаўніцтве дабіўшыся выкананьня плянаў калгаснага будаўніцтва на аснове марксыцка-ленінскіх прынцыпаў.

3. Абавязковае і рашучае палепшаньне арганізацыі працы ў калгасах, поўнае скарыстаньне працоўнай сілы шляхам пераходу на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, зьдельшчыну, ударніцтва, сацспаборніцтва і г. д.

3. Праверка і ўзмацненьне ўсёй работы па спэцыялізацыі калгасаў, па выкананьні пляну будаўніцтва і камплектаваньня спэцыялізаваных малочна-жывёлагадоўчых і сьвіноводных калгасаў і таксама правядзеньне практычных мерапрыемстваў па павялічэньні выхаду таварнай прадукцыі.

4. Ачыстка калгасаў ад клясава-чужых элемэнтаў падрываючых калгасны рух і рашучае палепшаньне працы з батрацтвам і беднатой.

Узмацненьне кіруючых органаў калгасаў і раённых калгасных саюзаў партыйна-камсамольскімі клясава-вытрыманымі, адданымі кіраваць калгасным будаўніцтвам, кадрамі з батрацтва, калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў, правяўшых сябе ў барацьбе за арганізацыю калектыўнай вытворчасьці.

У час перавыбараў неабходна забясьпечыць у складзе праўленьняў калгасаў дастатковую колькасьць камуністых, камсамольцаў, батракоў і беднякоў калгасьнікаў, а таксама і сераднякоў ні ў якім разе не ігнаруючы необходнасьці прыцягненьня іх да кіраўніцтва калгасамі выкарыстоўваньня іх гаспадарчага вопыту.

ЦК КП(б)Б зварочвае увагу партыйных арганізацый на необходнасьць рашучага павялічэньня колькасьці жанчын-калгасьніц у кіруючым складзе калгасаў. Процант жанчын калгасьніц у кіруючым складзе калгасаў павінен займаць ня менш 35 проц.

ЦК КП(б)Б ставіць практычную задачу перад партыйнымі арганізацыямі і калгасным сыстэмай вылучыць з ужо замацаваўшыхся калгасаў ня менш 500 лепшых актывістых калгасьнікаў для работы ў новаарганізаваемым калгасы, вылучыць ня менш 200 калгасьнікаў для сталай работы ў апараце Райкалгассаюзаў і 10 чалавек для сталай работы ў апараце Калгасцэнтру.

5. Абавязаць усе РК КП(б)Б і фракцыі Райкалгассаюзаў прыняць усе меры, якія забясьпечылі-б лепшае скарыстаньне і замацаваньне 25.000 на кіруючай працы ў калгасах. Неабходна з усёй рашучасьцю ўдарыць па спробах кулацтва дыскрэдытаваць 25-тысячнікаў.

6. Праводзячы шырокую масавую работу мабілізуючы актыўнасьць і самадзейнасьць калгасных мас і аднаасобнікаў на выкананьне задач веснавой сяўбы, неабходна разам з гэтым выкарыстаць справаздачна-перавыбарчую кампанію для рашучага ўзмацненьня і палепшаньня абслугоўваньня нацыянальных калгасаў, інтэрнацыянальнага выхаваньня калгасных мас і значна лепшай пастаноўкі культ-асьветрацы асабліва работы па ліквідацыі непісьменнасьці.

7. РК КП(б)Б распрацаваць канкрэтныя пляны правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў раёнах, вылучыць необходную колькасьць работнікаў для практычнага правядзеньня перавыбараў і шырока мабілізаваць навокал перавыбарчай кампаніі прамадзкасьць, улічваючы, што сталая падрыхтоўка і правядзеньне перавыбарчай кампаніі будзе садзейнічаць далейшаму разгортаньню калгаснага руху і замацаваньню існуючых калгасаў.

8. Аддзелу Агітацыі і Масавых кампаній ЦК КП(б)Б мабілізаваць у распараджэньне Калгасцэнтру ня менш 30 работнікаў для пасылкі у дапамогу мясцовым арганізацыям па правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

9. Культпропу ЦК даць паказаньні цэнтральным і мясцовым газэтам аб арганізацыі шырокага асьвятленьня ходу і вынікаў кампаніі ў друку.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Шаранговіч.**

Машыны не рамантуюцца, праўленьне бязьдзейнічае

Па Сьмілавіцкім раёне падрыхтоўка да веснавой сяўбы амаль не пачата. Калгас імя газэты «Савецкая Беларусь», Рудзенскага сельсавету, нават ня браўся за падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Збожжа стаіць у копах. Трэба яшчэ сказаць ,што на полі засталіся каля 5 га няўбранай сэрадэлі. Сельска-гаспадарчы інвэнтар не рамэнтуецца. Машыны на ачыстцы насеньня стаяць без работы. Як-жа тлядзіць на ўсё гэта праўленьне калгасу? Яно бязьдзейнічае.

Па бульбазагатоўках таксама выкавана толькі палова заданьня. Старшыня праўленьня адказвае:—Пасьнеем здаць і ўвесну.

Пляну сяўбы ў калгасе няма. Райкаапсаюз не зьвяртае належнай увагі на работу гэтага калгасу. Мясцовая парт'ячэйка не мабілізавала калгасьнікаў на ліквідацыю прарываў, на разгортваньне падрыхтоўкі да бальшавіцкай сяўбы.

Амаль не вядзецца падрыхтоўкі і па Рудзенскім, Дукорскім, Голацкім, Пяразэрскім і інш. сельсаветах. Райвыканком ня кіруе падрыхтоўкаю да сяўбы.

Брыгадзір **М. Піскун.**

Сьмілавіцкі р.

Т. Рачыцкі—упаўнаважаны СНК БССР

для правядзеньня с.-г. кампаніі 1931 году

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Для найбольш хуткага апэрацыйнага кіраваньня правядзеньнем сельска-гаспадарчай кампаніі 1931 г. Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе назначыць тав. Рачыцкага, Піліпа Мікалаевіча, Упаўнаважаным Савету Народных Камісараў БССР для правядзеньня сельскагаспадарчай кампаніі 1931 г. і тав. Масюкова, Кузьму Нічыпаравіча, яго намесьнікам.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў І ЭКАНА БССР **М. КАЛЕВІЧ.**

3 студзеня 1931 г.
г. Менск.

Аб веснавой пасеўнай кампаніі 1931 г.

Пастанова СНК БССР

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Земляробства аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі 1931 г., Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) пастанова СНК БССР за 3 сьнежня 1930 г. «Пра веснавую сельскагаспадарчую кампанію 1931 г.» (газ. «Савецкая Беларусь» № 285 за 9-XII 1930 г.) у частцы давядзеньня плянаў пасеўных плошчаў да савецкіх гаспадарак, калгасаў, вёсак і паасобных двароў Белсельтрэстам, Белкалгасцэнтрам і большасьцю раёнаў ня выкана;

б) мабілізацыя насенных і страхавых фондаў у калгасах і сялянскіх таварыствах узаемадапамогі, а таксама ачыстка і загатоўка насеньня, асабліва дэфіцытных культур (канюшыны, вікі, ільну, канапель, гароднага насеньня) праходзіць нездавальняюча; цэнтральныя і раённыя арганізацыі не зьвярнулі належнай увагі на загатоўку насеньня і складаньне насенных і страхавых фондаў;

в) Белсельтрэст, Трактарацэнтр, Сьвінаводтрэст і Насентрэст амаль не пачалі арганізацыі рамонтных майстэрань, а таксама рамонту трактараў і складаных сельска-гаспадарчых машын, што ставіць пад пагрозу своячасовую падрыхтоўку гэтых машын да веснавой пасеўнай кампаніі;

г) падрыхтоўка масавых кадраў, асабліва трактарыстаў, жывёлаводаў, кіраўнікоў калгасаў праходзіць зусім нездавальняюча; Белкалгасцэнтр, Трактарацэнтр, саўгастрэсты і раённыя выканаўчыя камітэты не зьвярнулі належнай увагі на гэтае вельмі важнае мерапрыемства;

д) ня гледзячы на тое, што Народным Камісарыятам Земляробства былі своячасова распрацаваны пляны пасеўных плошчаў, рамонтнай сеткі, рамонту трактароў і сельска-гаспадарчых машын, арганізацыі насенных і страхавых фондаў, загатоўкі насеньня, падрыхтоўкі масавых кадраў для савецкіх гаспадарак і калгасаў, адведзенымі цэнтральнымі установамі і арганізацыямі ня зроблен рашучы перадром у ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў;

е) цэнтральнымі арганізацыямі і ўстановамі і асабліва раённымі выканаўчымі камітэтамі не зварачаецца патрэбная ўвага на своечасовы падлік працы і інфармацыю Народнага Камісарыяту Земляробства аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, чым ствараюцца ўмовы, пры якіх немагчыма своячасова рэагаваць на недахопы ў правядзеньні гэтай кампаніі;

ж) асобнымі раённымі выканаўчымі камітэтамі падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі ня ўвязваецца з перавыбарамі сельскіх саветаў і не скарыстоўваецца, як палітычная кампанія, для шырокай мабілізацыі рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на правядзеньне гэтай пасеўнай кампаніі.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Даручыць Белсельтрэсту і ўсім раённым выканаўчым камітэтам зараз-жа давесьці пляны пасеўных плошчаў да савецкіх гаспадарак, вёсак і паасобных бядняцка-серадняцкіх двароў, а Белкалгасцэнтру давесьці пляны пасеўных плошчаў да калгасаў не пазьней 1-га лютага 1931 г.

2. Абавязаць калгасна-каапэрацыйную сыстэму, саўгастрэсты, упаўнаважанага Трактарацэнтру разгарнуць работу для складаньня насенных і страхавых фондаў, загатоўкі і ачысткі насеньня, арганізацыі рамонтных майстэрань, рамонту трактараў і складаных сельска-гаспадарчых машын і падрыхтоўкі масавых кадраў.

3. У адпаведнасьці з дырэктывамі Народнага Камісарыяту Земляробства СССР устанавіць наступны гранічны тэрмін для аканчэньня асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

а) збор насенных калгасных фондаў скончыць на 75 проц. да 1 лютага 1931 году, а рэшту—да 15 сакавіка 1931 г.;

б) аграмаджаньне насенных фондаў у новых калгасах, а таксама ў калгасьнікаў, якія ўвайшлі ў старыя калгасы, правесьці адначасова з арганізацыяй калгасаў і прыманьня новых членаў

в) раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя калгассаюзы і камітэты сялянскіх т-ваў узаемадапамогі павінны праверыць да 15 студзеня 1931 г. выдзяленьне старымі калгасамі насенных фондаў, збор фондаў камітэтамі сялянскіх т-ваў узаемадапамогі і парадак іх захаваньня;

г) збор страхавых фондаў у адзінаасобных гаспадарках скончыць не пазьней 1 лютага 1931 г., а таксама ўстанавіць нагляд за захаваньнем гэтых фондаў;

д) выдзяленьне браніваных фуражных фондаў у існуючых, а таксама і ў новых калгасах скончыць не пазьней 15 лютага 1931 г., а Белкалгасцэнтр павінен устанавіць кантроль за іх расходваньнем;

е) абмен звычайнага насеньня на гатунковае рабіць ў зімовы час з тым, каб была скарыстана санная дарога, і закончыць яго да 1-га сакавіка 1931 г.;

ж) рамонт трактараў савецкіх гаспадарак, калгасаў і машынатрактарных станцый зрабіць ня менш як на 75 проц. да 1-га сакавіка, а рэшту—да 1-га красавіка 1931 г.;

з) ачыстку насеньня зрабіць ня менш як на 75 проц. да 1-га сакавіка, а рэшту—да 1-га красавіка 1931 г.;

і) паказаньне і адвод зямлі калгасам скончыць не пазьней як за два тыдні да пачатку сяўбы; калгасам, якія арганізуюцца ў часе сяўбы, паказаньне зямлі рабіць не пазьней, як праз два тыдні э часу арганізацыі калгасаў.

4. Абавязаць усе раённыя выканаўчыя камітэты даваць своячасова інфармацыі аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Паказаць Лёзьненскаму, Горацкаму, Крупскаму, Мсьціслаўскаму, Хоцімскаму, Касьцюковіцкаму, Кармянскаму, Смалявіцкаму, Вузьдзенскаму, Прапойскаму, Расьнянскаму, Капаткевіцкаму, Нараўлянскаму, Брагінскаму, Магілёўскаму, Лупалаўскаму і Гомельскаму раённым выканаўчым камітэтам на зусім недапушчальныя адносіны, якія выявіліся ў няпрысылцы справаздачных даных за дзьве першыя дэкады сьнежня м-ца 1931 г.

5. Дазволіць Народнаму Камісарыяту Земляробства мабілізаваць студэнтаў Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі і зоатэхнічнага інстытуту для пасылкі ў раёны для дапамогі ў правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі тэрмінам э 1-га лютага да 15 красавіка 1931 г.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства і ўпаўнаважанага СНК для правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі дабіцца перабудаваньня працы ўсіх цэнтральных арганізацый (трэстаў і калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы) на баявыя тэмпы, прыцягваючы да суровай адказнасьці вінаватых у невыкананьні дырэктыў ураду па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі.

7. У сувязі з трудасьцямі ў забесьпячэньні прывозным жалезам майстэрань для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару, абавязаць усе арганізацыі і раённыя выканаўчыя камітэты мабілізаваць і скарыстоўваць мясцовыя рэсурсы для гэтай мэты.

8. Лічыць патрэбным на кожным пасяджэньні СНК заслухоўваць інфармацыю упаўнаважанага СНК для правядзеньня сельска-гаспадарчай кампаніі 1931 г. аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і ЭКАНА БССР **М. Калевіч.**

3 студзеня 1931 г.
Менск.

Скразны сацыялістычны дагавор

на ўдарную падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны

Перавыбарчая кампанія саветаў па Рафалаўскім сельсавеце, Магілёўскага раёну, выклікала вялізарнейшую хвалю творчай актыўнасьці ў гушчах калгасных мас. Задачы перавыбараў саветаў калгасьнікі шчыльна зьвязалі з тымі баявымі задачамі на гаспадарчым фронце, што пастаўлены перад калгасамі. Асноўная ўвага зьвернута на бальшавіцкую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны. Гэтае пытаньне перш за ўсё абгаворана кожным калгасам у паасобку і намечан шэраг канкрэтных мерапрыемстваў. **Адзінаццаць калгасаў праз сваіх упаўнаважаных падпісалі скразны сацыялістычны дагавор на спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да надыходзячай вясновай пасеўнай кампаніі.**

У сваім дагаворы калгасьнікі пастанавілі:

1. Усю ўвагу сканцэнтраваць вакол замацаваньня існуючых калгасаў, вакол арганізацыі новых масавых прыліваў з тым разьлікам, каб да вясны зрабіць Рафалаўскі сельсавет—сельсаветам суцэльнай калектывізацыі.

2 Не пазьней 1 студзеня скончыць абмалот ураджаю і адсыпаць насенныя фонды.

3. Да 15 студзеня ўтварыць абмен звычайнага насеньня на гатунковае і да гэтага-ж ліку ўтварыць ачыстку насеньня.

4. Ва ўдарным парадку скласьці і абгаварыць на сходах канкрэтны плян вясновай сяўбы, давёўшы яго да кожнага калгасьніка.

5. Да 1 лютага паставіць на баявую гатоўнасьць усе сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар. Зараз-жа даць заяўку ў Райкалгассаюз на недастаючую колькасьць машын.

6. Даручыць кожнай калгаснай сям'і (гаспадарцы) сабраць ня менш 48 кілёграм попелу.

7. Пляны будучай пасеўкампаніі павінны быць своячасова ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

8. Зрабіць карэннае палепшаньне сенажаці.

9. Прадаваць коняй толькі тых, якія яўна непрыгодны да работы, пры чым кожны выпадак шырока абгаворваць па пашыраных сходах калгасьнікаў.

10. Прасіць Райкалгассаюз вылучыць прэміі за лепшае правядзеньне пасеўкампаніі і разгарнуць работу за арганізацыю скразнога калгаснага спаборніцтва вакол гэтых прэмій

Заключаючы гэты дагавор, калгасьнікі Рафальскага сельсавету заклікаюць рабочых саўгасаў і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі зараз-жа па баявому разгарнуць падрыхтоўку да другой калгаснай вясны. Разам з гэтым яны выклікаюць на спаборніцтва калгасы і аднаасобныя гаспадаркі Бражаўскага і Вішаўскага сельсавету.

Пачын калгасьнікаў Рафальскага сельсавету павінен быць зараз-жа падхоплен усімі калгасамі БССР.

Семянкоў.

Не пазьней 1 лютага!

У Бабруйскім раёне стварэньне насенфондаў праходзіць марудна

Засыпка насенных фондаў па Бабруйскім раёне праходзіць надзвычайна дрэнна. Ня гледзячы на дырэктывы аб тым, што да 1-га лютага засыпка насенных фондаў павінна быць скончана, на сёньняшні дзень з агульнай колькасьці ў 45.040 цэнтн. засыпана толькі 10-15 проц.

Фактычна засыпка насенных фондаў праведзена толькі ў 4-х калгасах, у той час як у раёне налічваецца 50 калгасаў. У паасобных калгасах амаль што ня прыступлена да засыпкі насен-фондаў. Так, у калгасе «Чырвоны Араты» засыпана толькі 22 цэнтнэры, у калгасе «Свабода»—6 цэнтн.

Галоўнай прычынай маруднага ходу засыпкі насенных фондаў у калгасах зьяўляецца тое, што калгасы яшчэ і да гэтага часу ня прыступілі да абмалоту свайго збожжа. Калгасы «Селішча», «Прагрэс», «Чырвоны Партызан», «Чырвоны Баец» і інш. адкладаюць малацьбу на далейшы час.

Такія абыякія адносіны да складаньня насенных фондаў з боку калгасаў зрываюць плянавую падрыхтоўку да сяўбы, зрываюць справу ачысткі насеньня і абмену яго Раённым каапэрацыйна-калгасным арганізацыям трэба прыняць усе меры да таго, каб дырэктыва Наркамзему СССР аб засыпцы насенфондаў да 1 га лютага была безагаворачна выканана.

Д. Аланскі.

Бабруйскі раён.

Пастанова ЦК КП(б)Б

па дакладу Белкаапсаюзу аб становішчы грамадзкага харчаваньня

Заслухаўшы даклад БКС аб становішчы і далейшых мерапрыемствах па пашырэньні і палепшэньні якасьці грамадзкага харчаваньня па БССР Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што побач з колькасным пашырэньнем сеткі грамадзкага харчаваньня і колькасьцю выпускнай продукцыі (на 1-X—1929 г. было 64 сталоўкі з дзённым выпускам 27.825 абедаў; на 1-XII-30 г.—204 сталовак з дзённым выпускам 190.000 абедаў), становішча грамадзкага харчаваньня застаецца вельмі нездавальняючым як на колькасьці сеткі сталовак, так і асабліва па якасьці.

ЦК адзначае яшчэ зусім невыстарчальнымахоп асноўных груп рабочых грамадзкім харчаваньнем і зусім слабы ахоп членаў сем'яў рабочых, недапушчальна нізкую якасьць продукцыі, нявызначэньне спэцыяльных фондаў грамадзкага харчаваньня, нават для закрытых сталовак, празьмерна вялікія прыбыткі ў асобных сталовых, адсутнасьць дыфэрэнцыяцыі цэн, зусім дрэнная абслугоўваньне спажыўцоў, вялікія чэргі, назіраецца грубых адносін да спажыўца з боку працаўнікоў сталовых, антысанітарнае становішча ў сталовых, выпадкі шкодніцтва, а таксама неўпажлівыя адносіны з боку гаспадарчых арганізацый у справе палепшаньня грамадзкага харчаваньня на прадпрыемствах і фармальныя адносіны з боку асобных аб'яднаньняў НКГ да справы выкананьня плянаў па забясьпечаньні сталовых.

Для палепшаньня абслугоўваньня рабочых мас грамадзкім харчаваньнем і зьнішчэньня буйнейшых недахопаў якія ёсьць у гэтай справе ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. У мэтах першачарговага палепшаньня грамадзкага харчаваньня ў пралетарскіх цэнтрах і чыгуначных вузлах, Белкаапсаюзу на працягу першага кварталу забясьпечыць ахоп гарачымі стравамі рабочых усіх галоўнейшых галін прамысловасьці. Сьпіс гэтых прадпрыемстваў у дэкадны тэрмін узгадніць з ЦСПСБ, ВСНГ і НКГ.

2. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі і Гарсаветы максымальна дапамагчы каапэрацыяцыям у правядзеньні мерапрыемстваў па палепшаньні абсталяваньня заводзкіх сталовых і забясьпячэньне іх неабходнымі падсобнымі памяшканьнямі (кладовыя, ледніі, сутарэньні і інш.) асабліваю ўвагу зьвярнуць на поўнае забясьпячэньне начных зьмен гарачымі стравамі.

3. Абавязаць БКС разам з саюзам Харчавіко больш рашуча пацесьці барацьбу за палепшаньне якасьці продукцыі сталовых, за зьнішчэньне безгаспадарчасьці і расхлябанасьці працыдысцыпліны, рашучай барацьбы з разбазарваньнем і раскрадваньнем продуктаў і самазабясьпечаньнем, за палепшаньне санітарнага становішча ў сталовых, для чаго максымальна разгарнуць масавую работу сярод працаўнікоў сталовых, узмацніць культвыхаваўчую працу, больш рашуча вылучаць лепшых працаўнікоў грамадзкага харчаваньня на кіруючую працу ў сталых прадпрыемствах, асабліва зьвярнуць увагу на недапушчэньне забясьпячэньня сталовых недобраякасьнымі прадуктамі.

4. Адзначаючы яшчэ зусім нескую наладжанасьць абслугоўваньня рабочых-чыгуначнікаў грамадзкім харчаваньнем і слабы тэмп пераводу сталовых на кругласутачную працу, асабліва па абслугоўваньні пасажырскіх дваццатчыкаў грамадзкага харчаваньня, прыняць усе захады да забесьпячэньня будаўнічымі матар'ялямі пляну будаўніцтва грамадзкага харчаваньня, прыраўніў водпуск будаўнічых матар'ялаў для гэтай мэты да першачарговага будаўніцтва.

8. Абавязаць БКС зараз-жа прыняць усе захады да своечасовага атрыманьня ўсяго неабходнага абсталяваньня для наванага пабудаваных і арганізаваных сталовых.

9. Абавязаць БКС, Белсельтрэст, Сьвінавод, Насентрэст і інш. саўгаскія аб'яднаньні ня пазьней 1-II-31 г. распрацаваць пляны абслугоўваньня рабочых саўгасаў грамадзкім харчаваньнем, асабліва ў больш буйных саўгасах, адначасова з гэтым разгарнуць необходную растлумачальную працу сярод рабочых саўгасаў аб перадачы выдаваных рабочым на рукі прадуктаў у сталовую для патрэбаў грамадзкага харчаваньня.

10. У зьвязку з тым, што масавы рабочы кантроль вакол працы грамадзкага харчаваньня амаль-што не разгорнут, што ў барацьбу па зьнішчэньні маючыхся буйнейшых недахопаў у гэтай працы ня ўцягнуты рабочыя масы абавязаць ЦСПСБ, ЦП Саюзу Харчавіко, Райкомы КП(б)Б, ЦП Саюзаў, фракцыі Гарсаветаў і каапэрацыйных арганізацый зараз-жа безадкладна прыступіць да сапраўднага разгортваньня масавага рабочага кантролю над усёй працай грамадзкага харчаваньня.

11. Адзначаючы зусім невыстарчальную колькасьць падрыхтаваных кадраў для забесьпячэньня ўзрастаючай сеці грамадзкага харчаваньня абавязаць БКС разам з НКАсьветы распрацаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці адчыненьня спэцыяльнага тэхнікуму для падрыхтоўкі працаўнікоў грамадзкага харчаваньня, разам з гэтым фракцыі Праўленьня БКС, выходзячы з агульнага пляну падрыхтоўкі кадраў па спажыўкаапэрацыі значна ўзмацніць мерапрыемствы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы працаўнікоў, працуючых у прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня.

12. Лічыць немэтазгодным прымацаваньне да закрытых рабочых сталовых асобных прадпрыемстваў рабочых іншых прадпрыемстваў, дапускаючы прымацаваньне будаўнічых рабочых, працуючых на гэтым-жа прадпрыемстве.

13. Даручыць НК ЦКК-РСІ ўстанавіць сыстэматычны кантроль над выкананьнем гэтай пастановы. Праз 3 месяцы на Сакратарыяце ЦК КП(б)Б заслухаць даклад БКС і садаклад ЦКК аб грамадзкім харчаваньні.

14. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Раённыя зьезды калгасаў БССР

Згодна пастановы Калгасцэнтру, правядзеньне раённых зьездаў калгасаў намечана ў наступным тэрміне:

25-га студзеня—Асьвейскі, Расонскі, Лёзьненскі, Межанскі, Церахаўскі, Копыльскі, Капаткевіцкі, Бешанковіцкі.

1-га лютага—Дрысенскі, Дрыбінскі, Віцебскі, Копыскі, Ветрынскі, Высачанскі, Сураскі, Уваравіцкі, Бялынецкі, Хоцімскі, Камарынскі, Чырвона-Слабодзкі, Кармянскі, Грэскі, Бягомльскі, Жыткавіцкі, Сененскі.

6-га лютага—Боркавіцкі, Расьнянскі, Круглянскі, Вушацкі, Ляднянскі, Гарадоцкі, Буда-Кашалёўскі, Бярэзінскі, Касьцюковіцкі, Лоеўскі, Старобінскі, Чачэрскі, Вузьдзенскі, Плешчаніцкі, Юравіцкі, Тураўскі, Лупалаўскі, Глускі, Асіпавіцкі, Самахвалавіцкі.

11-га лютага—Полацкі, Крычаўскі, Коханаўскі, Вульскі, Дуброўненскі, Жлобінскі, Сьвіслацкі, Клімавіцкі, Брагінскі, Слуцкі, Журавіцкі, Койданаўскі, Лагойскі, Нараўлянскі, Лельчыцкі, Быхаўскі, Парыцкі, Рэчыцкі, Смалявіцкі, Сьмілавіцкі.

16-га лютага—Сіроцінскі, Чэрыкаўскі, Талачынскі, Лепельскі, Аршанскі, Багушэўскі, Рагачоўскі, Клічаўскі, Мсьціслаўскі, Любаньскі, Чырвонапольскі, Астрашыцка-Гарадзецкі, Каралінскі, Магілеўскі, Азарыцкі, Гомельскі, Барысаўскі, Пухавіцкі, Менскі.

21-га лютага—Віцебскі, Прапойскі, Чарэйскі, Чашніцкі, Шклоўскі, Крупскі, Чачэвіцкі, Горацкі, Хойніцкі, Стара-Дарожскі, Заслаўскі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Чавускі, Бабруйскі, Веткаўскі, Халопеніцкі, Чэрвеньскі.

Нормы прадстаўніцтва на раённыя зьезды калгасьнікаў ўстанаўліваюцца ад 10-15 членаў калгасу—адзін дэлегат.

На райзьезды неабходна прыцягваць з правам дарадчага голасу таксама прадстаўнікоў ініцыятыўных груп і груп беднаты.

Колькасьць дэлегатаў на раённым зьезьдзе павінна быць арыентавана 100-150 асоб.

Абвестка дня райзьезду раіцца наступная:

а) Справаздача Райкалгассаюзу (райкалгассэкцыі) аб яго дзейнасьці і пляны працы ў галіне падрыхтоўкі да веснавой пасеўкампаніі, арганізацыі новага прыліву ў калгасы і справаздача МТС, там, дзе апошнія маюцца.

б) Арганізацыя працы ў веснавую пасеўкампанію.

в) Аб мерапрыемствах па разьвіцьці жывёлагадоўлі ў калгасах і ў калгасьнікаў.

г) Выбары праўленьня райкалгассаюзу (райк

Па-бальшавіцку разгорнем падрыхтоўку да ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады

„Нарада склікаецца ў найадказьнейшы момант—у пачатку трэцяга рашучага году пяцігодкі, году завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай эканомікі СССР" („Правда").

Рабселькоры, слухайце!

У канцы студзеня месяца газэтай «Правда» склікаецца Ўсесаюзная рабселькораўская нарада, якая павінна будзе вырашыць цэлы рад палітычнай важнасьці пытаньняў рабселькораўскага руху. Рашэньне «Правды» аб скліканьні рабселькораўскай нарады набывае вялікае значэньне ў сьвеце тых задач далейшага разгортваньня сацыялістычнага наступу па ўсім фронце, якія на аснове рашэньня XVI зьезду УсеКП(б) і паўгадавога вопыту барацьбы за іх паставіў аб'яднаны снежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Вялізарныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, якія перад намі пастаўлены партыяй у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, павінны быць выкананы і перавыкананы. Для выкананьня гэтых баявых задач патрабуецца максымальная мабілізацыя рабочае клясы, калгасных і бядняцка-сераднякіх мас, узьняцьце на яшчэ большую вышыню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ большае разгортваньне самакрытыкі і крытыкі, якая дапамагае нам выкрываць усе недахопы нашай работы. Самакрытыка—моцны сродак барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правых і «левых» апартуністаў і прымірэнцтва да іх, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў усіх колераў.

У барацьбе за пасьпяховае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, у барацьбе супроць ўсякіх ухілаў ад яе партыйна-савецкі друк і армія рабселькораў мае вялікае значэньне. Друк і рабселькоры ў барацьбе за выкананьне другога году пяцігодкі адыгралі найадказьнейшую ролю. Ад друку патрабавалася апэрацыйнасьць у барацьбе за прамфінплян, максымальная здольнасьць хутка вырашаць палітыка-эканамічныя праблемы пяцігодкі, а галоўнае—ацягваць у іх ажыцьцяўленьне мільённыя рабочыя і працоўныя масы.

Памылкі і хібы, якія дапушчаў друк у сваёй рабоце, больш не павінны паўтарацца. Склікаемая «Правдай» рабселькораўская нарада будзе праходзіць пад кутам погляду мабілізацыі ўсяго друку, асабліва нізавога, і рабселькораўскай арміі на рашучую барацьбу за выкананьне вытворчай праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, пад кутом погляду ўзьняцьця рабселькораўскага руху на вышэйшую ступень.

Армія рабселькораў БССР у барацьбе за генэральную лінію партыі ішла і будзе ісьці пад кіраўніцтвам КП(б)Б у першых радох рабселькораўскага руху СССР. Ня гледзячы на шыленьне паасобных апартуністычных журналістаў (Ландау і Капцан), рабселькораўскі рух расьце і пашыраецца. Аб гэтым сьведчыць шпаркі ўзрост фабрычна-заводзкага і раённага друку. Так, калі ў БССР два гады назад мелася толькі 2-3 друкаваных фабрычна-заводзкіх шматтыражкі, дык зараз іх выдаецца каля 50. Амаль трэцяя частка раёнаў БССР зараз мае свае друкаваныя раёныя газэты. Гэта зьяўляецца лепшым адказам ныцікам-апартуністам, якія крычаць аб «заняпадзе» рабселькораўскага руху, якія крычаць аб тым, што рабселькораўскі рух перажывае «крызіс» узросту.

У газэце «Зьвязда» ад 1-га студзеня 1931 году былі зьмешчаны падрабязныя матар'ялы аб парадку падрыхтоўкі да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады. Рабселькоры газэты «Савецкая Беларусь» у падрыхтоўцы да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады павінны прыняць самы найактыўнейшы ўдзел. Трэба зараз-жа праз цэнтральны і раённы друк, шматтыражкі і насьценгазэты пачаць агляд становішча рабселькораўскага руху, які павінен быць праведзены пад лёзунгамі самакрытыкі, падрыхтоўкі друку да ўдарнага выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, вучоты лепшага вопыту, арганізацыйна-масавай работы друку ў другім годзе пяцігодкі і асобным квартале, разгортваньня самакрытыкі вакол пытаньня рабселькораўскім рухам з боку нізавога і цэнтральнага партыйна-савецкага друку і партарганізацый.

«Зьверху да нізу павінна быць разгорнута шырачэйшая кампанія самаправеркі выкананьня рабселькорамі і нізавым друкам на справе задачы барацьбы за генэральную лінію партыі», —так піша «Правда» ў артыкуле, прысьвечаным Усесаюзнай рабселькораўскай нарадзе. Газэта «Савецкая Беларусь», уключаючыся ў самаправерку, просіць усіх сваіх карэспандэнтаў і рабселькораў дасылаць матар'ялы, рэзалюцыі, якія-б адбівалі ход падрыхтоўкі да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады.

Арганізаванай падрыхтоўкай да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады, узьнімем рабселькораўскі рух і нізавы друк яшчэ на больш высокую ступень. Яшчэ больш мабілізуем рабселькораўскія масы праз ударныя рабселькораўскія брыгады на выкананьне вытворчай праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Выканаем поўнасьцю баявы лёзунг—«кожны рабселькор ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор». Кожны рабселькор, змагар за генэральную лінію партыі супроць ухілаў ад яе, змагар за пяцігодку ў чатыры гады.

Падрыхтоўка да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады супадае з выхадам першага нумару Ўсебеларускай газэты «Рабселькор». Шчыра вітаем выданьне газэты «Рабселькор». Газэта «Рабселькор» зьвяжа сапраўдным арганізатарам рабселькораўскіх мас у барацьбе за перамогу сацыялізму.

Я. Н—скі.

Да ўсіх рабселькораў БССР

Пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б пачынаецца выданьне раз у пяць дзён газэты «Рабселькор»—кіруючай газэты па пытаньнях рабселькораўскага руху і па пытаньнях работы фабрычна-заводзкіх і раённых партыйна-савецкіх друкаваных газэт БССР.

Газэта «Рабселькор», якая зьяўляецца органам аддзелу культуры і пропаганды Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і выданьнем Ц. О. газэты «Зьвязда», павінна адыграць вялікую ролю ў справе ўмацаваньня штодзённага партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і мабілізацыі рабселькораў на вырашэньне задач трэцяга году пяцігодкі, на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Неабходна зараз-жа забясьпечыць самы актыўны ўдзел у газэце «Рабселькор» усёй масы рабселькораў БССР, усіх рэдкалегій, фабрычна-заводзкіх, саўгасных, калгасных і вясковых газэт Беларусі.

Толькі пры непасрэднай, штодзённай сувязі з масай рабселькораў БССР, з рэдакцыямі цэнтральных і раённых газэт, з рэдкалегіямі шматтыражак і насьценных газэт, «Рабселькор» зможа выканаць свае адказныя задачы.

Пытаньне барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы на два франты,—супроць правага ўхілу як у тэорыі, так і на практыцы, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць права-«лявацкага» блёку, барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх колераў, супроць «левых» загібаў і прымірэнчых адносін да ўхілаў—зьяўляецца асноўнымі задачамі ўсяго нашага друку ў тым ліку і нанава арганізаванай газэты «Рабселькор».

Культпроп ЦК КП(б)Б, рэдакцыі газэт «Зьвязда», «Рабселькор», заклікаючы ўсю масу рабселькораў да непасрэднага ўдзелу ў газэце «Рабселькор», разам з тым, як адну з важнейшых задач высоўваюць справу камага шырокага распаўсюджаньня газэты сярод рабселькораў, рэдкалегій і шматтыражак, насьценных газэт і сярод работнікаў рэдакцый цэнтральных і раённых газэт.

Кожны рабкор, кожны селькор, юнкор, ваенкор, кожная рэдкалегія газэты, кожная партыйная, камсамольская ячэйка, фабзаўмясцком, дырэктар прадпрыемства, дырэктар саўгасу, праўленьне калгасу, РайРСІ, органы пракуратуры, рэдакцыі раённых партыйна-савецкіх газэт павінны быць удзельнікамі і падпісчыкамі газэты «Рабселькор».

Самае шырокае распаўсюджаньне газэты «Рабселькор», непасрэдны ўдзел у ёй шырэйшых мас рабселькораў зможа забясьпечыць у БССР далейшыя посьпехі рабселькораўскага руху, як аднаго з моцных вагароў партыі ў справе барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму.

У канцы студзеня 1931 году ў г. Маскве Ц. О. нашай партыі—газэта «Правда» склікае ўсесаюзную нараду па пытаньні рабселькораўскага руху.

Узмацненьне штодзённай палітычнавыхаваўчай работы сярод рабселькораў, ўцягненьне ўсіх рабселькораў у рады ўдарных брыгад, змаганьне за сустрэчны прамфінплян, падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны, выяўленьне і абагульваньне вопыту работы рабселькораў—павінна зьявіцца нашай падрыхтоўкай да ўсесаюзнай нарады. Мясцовыя і партыйныя арганізацыі павінны кіраваць праверкай работы рабселькораўскіх арганізацый у разгортваньні агляду і паказу лепшых узораў рабселькораўскай работы.

На аснове пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)—наперад да далейшых перамог у справе пасьпяховага ажыцьцяўленьня трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у справе завяршэньня ў 1931 годзе пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР!

Культпроп ЦК КП(б)Б.
Рэдакцыя газэты «Зьвязда».
Рэдакцыя газэты «Рабселькор».

Сход узварушыў рабселькораў

У палове сьнежня м-ца 1930 г. адбыўся сход рабселькораў Рагачоўскага раёну. На сходзе заслуханы быў даклад аб чарговых задачах рабселькораў.

Сход прайшоў пад знакам шырокай самакрытыкі. На сходзе рабселькоры абвесьцілі сябе ўдарнікамі па мабілізацыі сродкаў сярод насельніцтва, выклікалі на сацспаборніцтва рабселькораў Жлобінскага раёну.

Сход прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць беларускіх нацдэмакратаў, якія па ўказу польскага фашызму, разам з Рамзінымі і К° хацелі зрабіць інтэрвенцыю супроць СССР, і патрабавала іх суровага пакараньня.

Трэба адзначыць, што сход узварушыў рабселькораў раёну на яшчэ шпарчэйшае выкананьне ўсіх палітычна-гаспадарчых задач раёну.

Я. Савіцкі.

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

У Дукорскім сельсавеце складзена першая ў раёне сельская брыгада пры сямігодцы «16 партызан». У склад сельскараўскай брыгады ўваходзяць 10 актыўных рабселькораў. Брыгада абвясьціла сябе ўдарнай па выкананьні ўсіх задач ускладзеных партыяй. Сіламі гэтай брыгады арганізавана ўжо селькораўская брыгада і ў Рудзенскім сельсавеце пры калгасе. Селькораўская брыгада м. Дукоры паставіла сваёй мэтай пры кожным калгасе і сельсавеце па тэрыторыі 5 сельсаветаў скласьці селькораўскія брыгады.

Брыгадзір Лявіцкі Цімох.
Самахвалавіцкі раён.

Новыя кнігі

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Белдзяржвыдавецтва.

«Першая конная армія». Л. Клюеў. Стар. 66, цана 15 кап.

«Лёгкая кавалерыя». ЦК ЛКСМБ. Стар. 76, цана 15 кап.

«Парнікі і раньняя выганка гародніны». Аграном Ю. І. Шульман. Пераклад з яўрэйскай мовы. Стар. 70, цана 15 кап.

БАРАЦЬБА З РЭЛІГІЯЙ— БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Усе сілы бязбожнікаў—на выкананьне прамфінпляну. Ніводнага бязбожніка па-за ўдарнымі брыгадамі і сацспаборніцтвам. Рашуча змагацца з апартуністычнай недаацэнкай антырэлігійнай работы

„Нам не да антыкалядняй"..

Мы зацікавіліся—як праходзіць антыкалядная кампанія на прадпрыемствах хэмічнай прамысловасьці БССР.

Зварочваемся да загадчыка культсэктару ЦП саюзу хэмікаў тав. Гусева, а той кажа:

— Я нічога ня ведаю, бо толькі-што прыехаў з раёну, дзе працаваў некаторы час.

Аказваецца тав. Гусеў удзельнічаў у правядзеньні калдагаворнай кампаніі ў г. Гомлі.

— Вось і добра, што вы прыехалі з раёну, нам вельмі цікава будзе асьвятліць у друку, як на гомельскіх прадпрыемствах праводзіцца антыкалядная кампанія, гаворым мы т. Гусеву.

6 Увы і ах... Хоць адказны працаўнік ЦП саюзу хэмікаў і сядзеў у Гомлі, напэўна з тыдзень, але ён і тут адказаў:

— Я нічога па гэтым пытаньні ня ведаю.

— Бачыце, дадаў тав. Гусеў, мы зараз заняты калдагаворнай кампаніяй і нам не да антыкалядняй...

Як ня дзіўна, але загадчык культсэктару ЦП саюзу хэмікаў ня мог нам адказаць,—ці давала ЦП дырэктывы сваім нізавым прафарганізацыям па пытаньні антыкалядняй кампаніі (!?).

Пры праверцы аказалася, што ўсё-ж ЦП саюзу гэтыя дырэктывы дало, але што робіцца на мясцох і як ажыцьцяўляюцца дырэктывы нізавымі прафарганізацыямі... Ці варта аб гэтым гаварыць, калі загадчык культсэктару, будучы на Гомельскіх прадпрыемствах нават не пацікавіўся, як ажыцьцяўляюцца дырэктывы ЦП саюзу.

Такія адносіны да барацьбы з рэлігійным дурманам інакш нельга расцэньваць, як апартуністычныя.

Паданыя факты сьведчаць аб тым, што працаўнікі ЦП саюзу хэмікаў яшчэ не навучыліся ўвязваць правядзімых кампаній. Калдагаворная кампанія гэтага году зьяўляецца кампаніяй барацьбы за выкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі. Мы запытваемся ў ЦП саюзу хэмікаў, а антырэлігійная работа, ці не зьяўляецца яна баявой работай барацьбы за ўзьняцьце культурнага ўзроўню рабочых мас, за вызваленьне адсталых пластоў рабочых ад рэакцыі нага ўплыву рэлігіі, ці не зьяўляецца антыкалядная кампанія барацьбой з прагуламі, а разам з тым і барацьбой за выкананьне прамфінпляну?

В. П—ны.

Пад лёзунгам—абароны краіны,

за выкананьне пляну лесазагатовак

На Менскім заводзе «Дрэваапрацоўшчык» напярэдадні каляд па цэхах з рабочымі было праведзена некалькі гутарак на тэму аб антыкалядняй кампаніі. Асьвятляла гэта пытаньне і насьцен газэта. Антыкалядная кампанія на заводзе ўвязвалася з трохдзённікам абароны, які праводзіцца 7-9 студзеня.

6-га студзеня для рабочых заводу быў наладжаны антырэлігійны вечар. Нельга не адзначыць таго факту, што назначаны гэтымі днямі інтэрнацыянальны вечар ня мог адбыцца таму, што не зьявіўся выдучаны гаркомам партыі дакладчык. Рабочыя чакалі дакладчыка да 9 гадзіны ўвечары, так і не дачакаліся, праглядзелі кіна-карціну і разыйшліся па дамох.

На фабрыцы «Беларуска» антыкалядная кампанія разгорнута больш-менш здавальняюча. Па цэхах і ў чырвоным кутку вывешаны антырэлігійныя лёзунгі, з рабочымі праводзіліся гутаркі аб тэй шкодзе, якую рэлігія прыносіць сацыялістычнаму будаўніцтву. Гэтыя гутаркі наладжваліся супольна з прымацаваньнем да фабрыкі школай. 6-га студзеня для рабочых фабрыкі быў наладжаны антырэлігійны вечар з мастацкай часткай.

Па раёнах, па лініі саюзу дрэваапрацоўшчыкаў, сярод лесарубаў, антыкалядняя кампанія праводзіцца пад лёзунгам—ніводнага прагулышчыка ў дні каляд, за выкананьне пляну лесазагатовак. Гэтую кампанію на мясцох увязваюць з вярбоўкай новых рабочых для лесараспрацовак і лесазагатовак.

К. Ч.

Забыты вучастак работы

Падрыхтоўкі да антыкалядняй кампаніі ў Бабруйскай школе «Дорстройвуча» ніякай не вядзецца. Прафком і камсамольская ячэйка аб гэтым зусім забыліся. Ні на адным сходзе ня ставілася пытаньне аб разгортваньні антыкалядняй кампаніі. Не арганізаваны нават гурток «Бязбожнік» і ніякіх захадаў для стварэньня яго няма.

Трэба камсамольскай ячэйцы і прафкому неадкладна ўзяцца за разгортваньне антырэлігійнай работы.

Пратасеня Т. В.

Хто ў гэтым вінаваты?

Культмасавая і антырэлігійная работа ў Старасельскім сельсавеце наладжана дрэнна. Ячэйка ваяўнічых бязбожнікаў існуе толькі ў сямігодцы. Чытальня ў м. Старасельці ніякай працы не праводзіць, яна заўсёды на замку. Моладзь, ня маючы куды айсьці і заняцца культурнай справай, ходзіць у царкву. Ніякай растлумачальнай працы пра каляды не праводзіцца.

Партыйная і камсамольская ячэйкі антырэлігійнай работай ня цікавяцца. Усяму гэтаму трэба зараз-жа пакласьці канец. Антырэлігійную працу трэба паставіць на належную вышыню.

Селькор А. Генін.

ХРОНІКА

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў каб з першых дзён студзеня Ўсе ЦП саюзаў і фабзаўмясцкомы пачалі падрыхтоўчую работу да правядзеньня ленінскіх дзён.

Ва ўсіх бібліятэтах у ленінскія дні павінна быць вылучана ленінская літаратура і складзены рэкамэндацельныя сьпісы. У клюбах і чырвоных кутках на прадпрыемствах павінны быць арганізаваны выстаўкі да гэтых дзён аб жыцьці і рэвалюцыйнай барацьбе Леніна, увязваючы гэта з сёньнешнім посьпехам сацбудаўніцтва.

Фабзаўкомы ў ленінскія дні павінны арганізаваць масавыя экскурсіі рабочых і служачых у музэй рэвалюцыі.

ПЕРАВЫБАРЫ КАМСОДАЎ

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці кампанію па перавыбарах камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе па прадпрыемствах і ўстановах у гарадох на працягу лютага месяца, а ў сельскіх мясцовасьцях—у студзені.

ПЕРАПЫНАК У ТЭХНІКУМАХ

Наркамасьветы абвяшчае, што нарада дырэктароў тэхнікумаў і БДУ пастанавіла, у сувязі з труднасьцямі ў апале, зрабіць зімовы перапынак у БДУ і тэхнікумах Менску, падпарадкаваных Наркамасьветы, у першай дэкадзе студзеня.

КАДРЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ «25-ці ТЫСЯЧНІКАЎ»

Для падвышэньня кваліфікацыі «25-ці тысячнікаў», якія знаходзяцца на калгасна-каапэрацыйнай рабоце з 20-га студзеня адкрыты курсы па падрыхтоўцы 25 тысячнікаў.

Для правядзеньня гэтых курсаў адпушчана 6.000 руб.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ВАПНАВАНЬНЕ І ТАРФАВАНЬНЕ ГЛЕБЫ.

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) выкананьне пляну вынаваньня глебы сарвана: у 1928-29 г. выканана толькі каля 16 проц. пляну (завапнавана 3980 га ў параўнаньні з плянам у 25 тыс. га), у 1929-30 г. выканана 20 проц. (завапнавана 15 тыс. га у параўнаньні з плянам у 75 тыс. га);

б) асноўнымі прычынамі невыканаваньня пляну вапнаваньня глебы зьяўляюцца:

1) дрэнная арганізацыя гэтай справы наогул і слабае ўцягненьне ў гэтую працу аграномічнага персаналу і савецкай грамадзкасьці;

2) нездавальняючая арганізацыя перавозкі вапны савецкімі гаспадаркамі калгасамі і селыска-гаспадарчымі аб'яднаньнямі і не арганізаванасьць вывазкі вапны індывідуальнымі гаспадарамі;

3) недастатковыя работы для адшуканьня вапны і значная адлегласьць месцазнаходжаньня вапны ад месц спажываньня;

в) нездавальняючя ўжываліся мерапрыемствы для тарфаваньня глебы (у 1929-30 г. было затарфавана толькі 8 тыс. га альбо 20 проц. заданьня), ня гледзячы на тое, што песчаныя глебы знаходзіліся каля торфавых балот.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, а таксама для выкананьня пляну вапнаваньня глебы, вызначанага пастановаю СНК БССР за 3 сьнежня 1930 г., СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Даручыць Белсампрамсаюзу загатовіць патрэбную колькасьць вапнавай і крэйдавай мукі і прадугледзець ў 1931 г., апроч гэтага, загатоўку ў летні і асенні час сыравіны, асабліва сушанай крэйды, для перамолу яе зімою ў 1932 г. у разьмеры ня менш 150 тыс. тон, для чаго скарыстаць сапную дарогу для перавозкі вапны ў савецкія гаспадаркі і калгасы.

2. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства забясьпечыць падлік вынікаў вапнаваньня г... ў савецкіх гаспадарках і калгасах праз належныя інстытуты і апублікаваць даныя аб эфэктыўнасьці яго.

3. Прапанаваць ВСНГ і Геалёгічнаму інстытуту Беларускай Акадэміі Навук узмоцніць работы для адшуканьня накладаў апраруд, патрэбных для вапнаваньня глебы, асабліва ў тых раёнах, дзе глеба патрабуе вапнаваньня ў першую чаргу.

4. Даручыць Белдзяржпараходству ўлічыць пры разгортваньні свае працы па перавозцы грузаў і перавозку вапнавай і крэйдавай мукі па рэках.

5 Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белсельгаспбанку і Ўпаўнаважанаму Трактарацэнтру забясьпечыць у 1931 г. вапнавымі сеялкамі і спэцыяльнымі прыладамі для расьсеву да трактарных цялежак, укамплектаваўшы гэтымі прыладамі існуючыя трактарныя станцыі і калёны тых раёнаў, дзе праводзіцца вапнаваньне глебы.

6. Улічваючы, што на тэрыторыі БССР ёсьць сялікая колькасьць балот, якія можна распрацоўваць без папярэдніх асушак і здабываць торф на ўгнаеньне, абавязаць Народны Камісарыят Земляробства распрацаваць вытворчую праграму для савецкіх гаспадарак, а Белкалгасцэнтру—для калгасаў і выдаць спэцыяльную інструкцыю аб ужываньні ў парадку аграмінімуму тарфаваньня глебы ў аднаасобных бядняцка - сераднякіх гаспадарак, улічыўшы патрэбу давядзеньня канкрэтных заданьняў па тарфаваньні глебы да калгасаў і савецкіх гаспадарак.

Абавязаць усе прадпрыемствы і арганізацыі, якія здабываюць торф, перадаваць бліжэйшым савецкім гаспадаркам і калгасам ўсю торфавую крошку, што атаецца і не скарыстоўваецца прадпрыемствамі для падсьцілкі і ўгнаеньня.

7. Даручыць НК РСІ праверыць як выконваецца пастанова СНК аб скарыстаньні крэйды на Добрускай ф-цы і аб выніках праз тры дэкады далажыць СНК.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. БЭНЭК.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. КАЛЕВІЧ.**

23 сьнежня 1930 г.
г. Менск.

Апавяшчэньні

8-га студзеня 1931 г. а 6-ай гадзіне увечары ў памяшканьні ЦВК БССР абудзецца пасяджэньне Прэзыдыуму Нацкамісіі ЦВК БССР сумесна з брыгадзірамі, якія згодна з пастановай ЦК КП(б)Б выяжджалі ў раёны па перавыбарам нацсаветаў.

Прысутнасьць на пасяджэньні Камісіі ніжэйпамянёных таварышоў абавязкова.

Т. т. Іткін—Рэдакцыі «Юнгер Арбэтэр», Окунь—Еўпэдтэхнікум, Альтман—Цэнтравыдавецтва, Гольдман — Арцель «Пралетары», Эфрон—Белсельпрамсаюз, Трус—БДУ, Рагінскі—БДУ Рымашэўскі—БДУ, Мікуш—Жакт № 12, Кукелка—Польпэдтэхнікум, Дзяржынская—НК Асьветы, Яніцкі—Польскі н-суд, Бернацкі—Белдзяржбуд, Сьвіш—Паліт. Алдзел № дывізіі, Шкільтэр—БАН, Спарынскі—НК Асьветы, Мееровіч—Менскі Гарсавет, Гінзбург—Студэнт «Барысаўскі студ. барак № 1 кв. 5», Юдэпыс—Белпэдтэхнікум, Вайшнырас—Рэд. «Раўданасіс Артоіс», Рагоўскі—Белкамзэт.

Адказны Сакратар Нацкамісіі ЦВК **Ф. Гольмшток.**

Сацыяльна-бытавы сэктар ЦСПСБ склікае 9 студзеня, а 7 гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пакой 10, нарада па пытаньні аб дзейнасьці Інстытуту Аховы Працы пры НКП БССР»

Дакладчык—дырэктар Інстытуту С. Р. Дзіхцяр.

На нараду выклікаюцца кіраўнікі сан. бытавых сэктараў ЦП Саюзаў, кіраўнікі сацыяльна-бытавых сэктараў Фабзаўмясцкомаў (быв. Камісіі па ахове працы), старшыні Наркампрацы, ВСНГ, НК Аховы Здароўя, Гарадраву, Гар. Інспэктараў Працы, Гар. Страхкасы, газэт, навукова-дасьледчых устаноў і наступныя таварышы:

Бакштэйн І. М., Хмяльніцкі І. І., Допаліцкі М: Б:, Хлаўновіч М. Ш., Тарноўскі Е. Г., Левін Г. І., Левін А. Я:, Крывашэяў А. І., Гатаўскі І. Е., Гольд, Ледэр, Вэйнгауз, Яўтохоўскі І. Ф., Сандлер В. М., Протас Е. В., Арлюк А: А:, Загельштэйн С., Цытвэр І. Г., Курган Д. Я:, Файбышаў І. М., Зуеўскі В. К., Крупец Н. Н:, Баран Я: М:, Ружынскі, Вольфсан, Чарвякоў К. В. Кантар М. А., Роккінд Ф. Ш., Жукаборскі С: І., Нісанс Р. З., Бурштэйн Ф. Г., Сагаловіч А. Х., Доўнар Ф. Ф., Эстэркін Б. Ф., Майзэль Н. А., Шайкоўскі А. С., Кабакоў І. Х., Гітлін, Паўлаў, Андрэяў А. П., Эльтэрман Р. Г., Левін А. К., Голубіў А. І., Фрыдман Н. А., Скорабагаты М. І.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня 8-І—г. т. а 7-й гадз. увечары адбудзецца нечарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦП Саюзу Працасьветы разам з профактывам (Сакратары ГК, МК, Прафкомаў. Кіраўнікі груп дабраахвотнікаў і інш.).

На абвестцы дню: Вынікі перавыбарчай кампаніі прафарганізацый Саюзу Працасьветы.

Заўтра 8-І у 10 гадзіне раніцы ў залі пасяджэньня БАН, НКРСІ склікае нараду брыгадзіраў і адказных прадстаўнікоў ніжэйпералічаных устаноў па пытаньні агляду працы і становішча БАН. Наступныя ўстановы і прадпрыемствы павінны прыслаць сваіх прадстаўнікоў на нараду: 1) Фабком заводу «Энэргія», 2) фабком заводу «Камунар», 3) Нацкамісія ЦВК БССР, 4) ЦСПСБ, 5) Наркамасьветы, 6) Нарком аховы здароўя, 7) ЦП Саюзу Працасьветы, 8) Сэкцыя навуковых працаўнікоў, 9) ВСНГ БССР, 10) Калгасцэнтр, 11) Наркамзем, 12) Белкаапсаюз, 13) Мэд'інстытут, 14) БДУ, 15) Хэм.-тэх. Інстытут, 16) Інстытут прамысловасьці, 17) БелАГП. 18) Комвуз, 19) Рэдакцыі газэт: «Зьвязда», Савецкая Беларусь», «Акцябр», «Орка», і літоўская газэта.

ПАПРАЎКА

У артыкуле тав. Гея: «КП(б)Б у барацьбе за генэральную лінію партыі» («Савецкая Беларусь», № 5) у 9-ым абзацы першай калёнкі ўкралася памылка. Замест слоў: «за зьвышчэньне рэштак фабрычнай няроўнасьці», трэба чытаць: «за зьвышчэньне рэштак фактычнай няроўнасьці» і г. д.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	Назначаны па 11 студзеня паказ для Менрайпромсаюза **„1-я конная"** пераносіцца на 10 студзеня. Усе білеты сапраўдны.
Кіно-тэатр „Культура"	З панядзелка 5 студзеня новы нямецкі фільм **„Нявольнікі бледнай гары"** драма ў 7 частках. Хроніка сакзкіно № 62. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	З панядзелка 5 студзеня З прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень пастаноўкі гістарычнага фільму **„Паэт і цар"** пачатак а 6 г. 30 хв. Каса а 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	ІГАР ІЛЬЛІНСКІ ў лепшай камэдыі сэзона **„Сьвята сьв. Іоргена"** у 7 частках. Пачатак а 6 гадзіне. Каса ад 4 з паловай гадз.
Дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"	Ад панядзелка 5 студзеня 1-ая сэрыя **„Чырвоныя дзьяваляты"** Пачатак а 1-й гадзіне Каса а 12.
Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"	Ад 5 студзеня мастацкі фільм **ГАРАДЫ І ГОДЫ** Драма ў 9 частках. 2. **ХРОНІКА САЮЗКІНО № 69.** 3. **ГУКАВЫ КІНО-КАНЦЭРТ.** Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз

З прычыны адсутнасьці лінейнай і станцыйнай ёмкасьці, далейшая ўстаноўка тэлефонаў

СПЫНЕНА

Паданыя заявы будуць выкананы толькі пасьля адчыненьня АТС.

Просьба да ўсіх устаноў своечасова паведамляць станцыю аб зьняцьці тэлефонаў, вострая патрэба ў якіх мінавала

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР ПАДАЕ ДА АГУЛЬНАГА ВЕДАМА,

што 5-га студзеня 1931 г. ім унесена ў 2-гі разьдзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) ніжэйпамянёнае дзяржаўнае прадпрыемства:

1. Пад № 66 Беларускае Дзяржаўнае Гандлёва-Прамысловае Будаўнічае Аб'яднаньне пад назвай

„БЕЛДЗЯРЖГАНДПРАМБУД",

існуючае на пачатках гаспадарчага разьліку, знаходзячаеся ў веданьні Наркамгандлю БССР і маючае мэтай распрацоўку і складаньне рабочых чарцяжоў, праектаў і каштарысаў, а таксама вытварэньне будаўнічых і рамонтных работ па будаўніцтву, абсталяваньні і пераабсталяваньні прадпрыемстваў усіх арганізацый, падпарадкаваных Наркамгандлю БССР і мясцовай харчовай прамысловасьці.

2. Статут прадпрыемства зацьверджан Наркамгандлю БССР 12 сьнежня 1930 г.

3. Статутны капітал вызначаецца ў суме 300 тыс. (трыста тысяч), якія разьмяркоўваюцца паміж паказанымі ўдзельнікамі аб'яднаньня наступным чынам:

Белсельпрамаб'яднаньне—95 тыс. руб. (дзевяноста пяць тыс. р.), Белпчаціна—25 тыс. р. (дваццаць пяць тыс. р.), Белдзяржспірт—25 тыс. р. (дваццаць пяць), Дзяржгандбел—15 тыс. р. (пятнаццаць тысяч), Белуціль—20 тыс. руб. (дваццаць тыс. р.), Белсадгародніна—15 тыс. р., (пятнаццаць тыс. р.), Белмяса—45 тыс. руб. (сорак пяць тыс. р.), Белрыба—15 тыс. р. (пятнаццаць т. р.) і Бел. К-ра Саюзхлеб—45 тыс. руб. (сорак пяць тыс. р)

Месца знаходжаньня „Белдзяржгандпрамбуду" г. Менск.

Сакратар Наркамгандлю БССР ЯЗЬМІР.

У чацьвер 8-га студзеня а 3-й гадзіне дня ў памяшканьні РЭДАКЦЫІ ГАЗ. „БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА" (Савецкая 68, 2 гі п.в.).

У сувязі з зімовымі канікуламі ў начальных установах, рэдакцыя газэты „БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА"

СКЛІКАЕ ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

сельскоръ-студэнтаў па пытаньнях аб удзеле студэнтаў-карэспандэнтаў у падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы і ўдзеле ў падрыхтоўцы да Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

На нараду запрашаюцца карэспандэнцкія брыгады Рабфаку, Транспартна-экспедыцыйнага тэхнікуму, аднагадовых пэдкурсаў, а таксама ўсе выяжджаючыя ў вёску студэнты карэспандэнты Белпэдтэхнікуму, 2-х гадовых пэдкурсаў, Палітэхнікуму і іншых навучальных устаноў.

Масава апэрацыйны сэктар газэты „Беларуская Вёска"

Менскае праэктна-мантажна-гандлёвае аддзяленьне ўсесаюзнага электратэхнічнага аб'яднаньня **„ВЭО"** (Менск, Савецкая 68)

даводзіць да ведама ўсіх дзяржаўных і каапэрацыйных прадпрыемстваў, **ШТО З 1-га СТУДЗЕНЯ 1931 Г.** кабельная прадукцыя выпрацоўваемая заводамі „ВЭО" разьмяркоўваецца **ў цэнтралізаваным парадку** выключна праз камэрцыйнае кіраўніцтва „ВЭО" у Маскве, з прычыны чаго ўсе заказы на кабельныя вырабы належыць накіроўваць па адрасу: МОСКВА, АРМЯНСКІЙ ПЕР. № 6 КОМНАТА 43 КОММЕРЧЕСКОЕ УПРАВЛЕНИЕ „ВЭО", кабельная группа.

Усім галінавым аб'яднаньням належыць падаваць заказы ў цэнтралізаваным парадку на пластаво выдзеленых ім фондаў ПТЭУ ВСНГ СССР, аб чым галінавыя аб'яднаньні павінны паведаміць свае філіялы.

Заказы на мантажныя работы прымаюцца нашымі без абавязальства дастаўкі кабельных вырабаў, г. зн. з кабельн